Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Яўген Лукша ☞ 8

Ці будзе тут нафтабаза? ☞ 3

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 40 (2734) Год LIII | Беласток, 5 кастрычніка 2008 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Орля на скрыжаванні светаў!

Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

На першым плане Сяргей Мартыновіч

Ну, нарэшце і ў нас штосьці робіцца! — Аляксандр Ярымовіч з Орлі пад уражаннем таго, што ў апошні час дзеецца ў культуры ў Орлі. А дзеецца столькі, што адразу не спамятаеш, асабліва, калі побач вас таленавіты расказчык — Сяргей Мартыновіч, старшыня Таварыства сяброў Арлянскай зямлі. Карацей, за год сваёй дзейнасці Таварыства арганізавала тры культурныя мерапрыемствы: дзве фотавыстаўкі пра мінулае Орлі і этнаграфічную прэзентацыю гміны, зробленую са смакам і моцным інтэлектуальным зарадам. Вось і нядаўна, 20 верасня г.г., Таварыства сяброў Арлянскай зямлі і войт гміны Орля запрасілі на знакамітую фотавыстаўку пад загалоўкам „Жыхары Орлі — гісторыя і сучаснасць". Акцыі садзейнічалі прэзентацыі двух фільмаў: „Скрыжаванне Орля" і „Руская полька", музычныя выступленні ды сантыментальныя ўспаміны і дыскусіі ў групах.

— Год таму прыйшло яшчэ больш людзей, — успамінае Сяргей Мартыновіч, — бо тады многія арляне мелі нагоду першы раз у жыцці пабачыць інтэр'ер сінагогі. Больш за шесцьдзесят гадоў гэты самы прыгожы будынак у рэгіёне служыў складам вапны і мінеральных угнаенняў, сена, хлявом для авечак. Быццам на злосць, як дапаўненне трагічнага лёсу яўрэяў, якія да вайны складалі тут 80 працэнтаў насельніцтва. Таму, як заявіў мне Сяргей Мартыновіч, іх таварыства зробіць ўсё, каб аднавіць сінагогу і памяць пра тутэйшых яўрэяў. Не для праектаў, як гэта робіцца ў наш час, а для саміх сябе, для маладых, каб ведалі свае карані, каб ведалі хто яны, якая ў іх сіла...

— Яўрэяў выбілі фашысты, а мы і без таго згінем, — заўважае горка Сяргей Мартыновіч. — Як так далей пойдзе, то і па беларусах нічога не астанецца!

— Ці школа заангажаваная ў захаванні памяці пра мінулае? — пытаю ў Дарыюша Гарадэцкага, дырэктара комлексу школ у Орлі.

— Мы ад пачатку супрацоўнічаем з таварыствам, у школе дзейнічае рэгіянальны гурток, у якім за дваццаць маладых сяброў. Яны дапамагалі і ў арганізацыі сённяшняга мерапрыемства.

Так як і сам спадар Гарадэцкі, які ўласнаручна сканіраваў старыя фатаграфіі і аддаў для апрацоўкі ў Варшаву 120 здымкаў.

Калі гаварыць пра „праекты для праектаў", дык яны маюць свае паслядоўнасці, словам, забіваюць уяўленне! Я таксама, калі ехала ў арлянскую сінагогу на мерапрыемства, думала пра адно — што ўся тэматыка будзе прысвечана яўрэям. На месцы я пабачыла канцэпт суіснавання ў культуры. Хоць у асноўным прэзентаваліся хрысціянскія роды (каб людзі маглі паўспамінаць сваю маладосць — як сказаў старшыня), паўсюдна прасочваўся яўрэйскі ўплыў, найперш у эстэтыцы.

— Я гляджу і не магу надзівіцца, — кажа пра людзей на здымках з пачатку мінулага стагоддзя спадарыня Зоя Майстровіч, народная паэтка з Рудутаў. — Гляньце, якая ў іх вопратка, як яна добра пашытая. І якія густоўныя прычоскі, асабліва ў жанчын... Усе элементы вопраткі дапасаваныя, проста, як з журнала...

Мяне асабліва ўразіла падабенства паміж яўрэйскай і хрысціянскай моладдзю на школьным здымку з 1935 года. Калі б не імёны і прозвішчы, іх немагчыма было б адрозніць. Тут спрацавала старая праўда, паводле якой, культура ўплывае мацней на фармаванне выгляду чалавека, чым этнас. (Нядаўна, адзін грамадзянін ЗША на пытанне на каго ён прагаласуе ў прэзідэнцкіх выбарах, адказаў: „На Барака Абаму". Чаму? „Бо ён выглядае як сапраўдны амерыканец!")

На старых арлянскіх здымках, калі ідзе пра выгляд, многія жыхары — еўрапейцы. Каб адчуць гэтую асаблівасць, варта прыгледзецца здымкам пасляваеннага перыяду, размешчаным на паралельнай сцяне залы. Свет рэальнага сацыялізму, без яўрэяў, быццам здэфармаваны. Дарэмна шукаць той даваеннай элегантнасці і задуменнасці ў абліччах „самых шчаслівых людзей свету". Нават, калі яны абкладзены музычнымі інструментамі і ў каляровых касцюмах. Сапраўды — свет без яўрэяў сумны і не прыгнятальны. Добра, што яўрэйскі матыў прысутны ў фільме „Скрыжаванне Орля", для якога сцэнарый напісала ўраджэнка Орлі, прафесар Малгажата Кавальская. (Фільм узнік на гранты Таварыства сяброў Арлянскай зямлі). Гэта асаблівае падарожжа ў глыб гісторыі, ад Радзівілаў па сучаснасць, якую прадстаўляюць мясцовыя школьнікі з песняй „Дзе бы ты не пасяліўся" на вуснах. Песня, у многім сімвалічная. Калі глянуць на людзей, што ўзяліся за вяртанне памяці Орлі, ці на самое Таварыства сяброў Арлянскай зямлі, то большасць з іх, у тым ліку і сам старшыня — рээмігранты.

* * *

У час выстаўкі я пазнаёмілася з аматарам-фатографам Аляксандрам Ярымовічам, нашчадкам старога арлянскага роду.

— Я пачаў фатаграфаваць у 15 гадоў, — расказвае спадар Ярымовіч. — Маім майстрам быў сам Мікола Нестаровіч. У войску я дапамагаў свайму шэфу праяўляць здымкі ў фоталабараторыі. Хоць па прафесіі я земляроб, ніколі не расставаўся з фотаапаратам. І зараз у мяне ў сямейным архіве некалькі тысяч здымкаў. Частка з іх патрапіла на сённяшнюю выстаўку. І нядаўна, калі пажарнае дэпо адзначала свой юбілей, здымак Аляксандра Ярымовіча паслужыў фонам для плакатаў і дэкарацыі сцэны.

— А вы самі не з Ізраіля? — нечакана спытаў мяне субяседнік.

— А...?

— Бо ў мяне была сяброўка падобная на вас, такая чорная. Зараз яна палкоўнік ізраільскай арміі. Дзесяць гадоў таму яна прыязджала ў Орлю, пытала пра людзей...

У такі спосаб мы згаварыліся пра адзіную ацалелую сям'ю кафляра Ізбуцкага з Орлі. Зараз частка Ізбуцкіх пражывае ў Ізраілі. Нядаўна жаніўся ўнук арлянскага кафляра, на вяселлі гуляла трыста гасцей, сярод іх арлянскія яўрэі (што паспелі з'ехаць яшчэ да вайны).

— І мы ў якасці шлюбнага падарунка паслалі ім даваенныя здымкі іх сям'і. Гэтыя здымкі захаваліся ў нашых хрысціянскіх хатах, — кажа Сяргей Мартыновіч.

XII Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы

Рэдакцыя „Нівы" і Беларускі саюз Рэспублікі Польшча аб'яўляюць XII Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы. У конкурсе будуць разглядацца працы грамадзян Польшчы на беларускай мове.

Прынцыпы ўдзельніцтва

1. Конкурс праводзіцца ў дзвюх узроставых групах:

— **I група:** дзеці і моладзь пачатковых школ і гімназій,

— **II група:** астатнія ўдзельнікі (выключна аўтары, якія не з'яўляюцца членамі літаратурных творчых саюзаў).

2. У рамках груп конкурс праводзіцца ў дзвюх катэгорыях: паэзіі і прозы.

3. Конкурсныя працы, надрукаваныя на машынцы або разборлівы рукапіс у чатырох экземплярах (паэтычныя творы — 3-5 вершаў, іншыя літаратурныя формы — аб'ёмам да 22 старонак стандартнага машынапісу) трэба падпісаць крыптанімам, пазначыць нумарам узроставай групы і паслаць на адрас: **Redakcja „Niwy", ul. Zamenhofa 27, 15-959 Białystok 2, skr. poczt. 84** з прыпіскай на канверце: XII Ogólnopolski Konkurs Poezji i Prozy Białoruskiej.

4. Прозвішча, імя і дакладны адрас аўтара дасланых конкурсных прац трэба памясціць у асобным заклееным канверце, падпісаным звонку такім нумарам групы і крыптанімам, як і конкурсныя працы.

5. На конкурс трэба дасылаць творы, якія дагэтуль нідзе не друкаваліся і не ўзнагароджваліся на іншых конкурсах.

6. Арганізатары не вяртаюць дасланых твораў.

Тэрміны

1. Тэрмін дасылання конкурсных прац мінае **26 кастрычніка 2008 г.** (вырашае дата паштовага штампа).

2. Вынікі конкурсу будуць аб'яўлены ў лістападзе 2008 г.

3. Уручэнне ўзнагарод адбудзецца на адмысловай сустрэчы. Аб тэрміне мерапрыемства лаўрэаты і астатнія ўдзельнікі конкурсу будуць паінфармаваны і запрошаны прыняць у ім удзел.

Узнагароды

1. Арганізатары прыдбалі вартасныя ўзнагароды.

2. Арганізатары ўстанаўліваюць узнагароды для найлепшых дэбютантаў. Аб падзеле і вартасці астатніх узнагарод рашае ўстаноўленае арганізатарамі журы.

Сакратарыят конкурсу:

Redakcja „Niwy", ul. Zamenhofa 27, 15-959 Białystok, tel. 085 743 50 22.

Конкурс праводзіцца пры фінансавай падтрымцы Міністра ўнутраных спраў і адміністрацыі.

9 770546 196000

Выбары пакажуць?!

Як гэты артыкул будзе надрукаваны, парламенцкіх выбараў на Беларусі ўжо не будзе. Яны скончацца. Але яшчэ да іх пачатку менавіта гэтая выбарчая кампанія на Беларусі была як ніколі ахутаная туманам таямнічасці, інтрыганства і здрады.

Ад пачатку хадзілі чуткі пра дамоўленасці беларускіх улад з заходнімі палітычнымі коламі пра тое, што ў беларускім парламенце будзе некалькі апазіцыянераў. Іх проста туды прызначаць і ўключаць у агульны спіс прызначаных. Пасля правядуць няхітрую працэдуру пад назвай „выбарчы працэс" і справа зробленая. За гэта дэмакратычны Захад, які прызнае толькі справядлівыя дэмакратычныя выбары, а не прызначэнне дэпутатаў уладай, нібыта абяцаў паздымаць з Беларусі эканамічныя санкцыі і дазволіць невыязным беларускім чыноўнікам адпачываць у лепшых дамах Парыжа і Берліна.

Хтосьці верыць у тое, іншыя лічаць немажлівым. Праверыць, праўда гэта ці не, ужо засталося няшмат часу. Як гаворыцца — выбары пакажуць.

Але і на сённяшні дзень яны, выбары, ужо паказалі нашмат больш, чым можна было сабе ўявіць. Перш за ўсё паказалі жывучасць існага рэжыму. Кіраўнік беларускай дзяржавы можа дазволіць сабе паставіць ультыматум усяму Захаду, папалохаць яго, што калі выбары не будуць прызнаныя, то ён увогуле з Захадам размаўляць не будзе, і ўвесь Захад імгненна пачынае апраўдвацца перад гэтым чалавекам. Палітыкі Еўропы пачынаюць тлумачыць яму, а таксама адзін другому, самым сабе і ўсяму еўрапейскаму грамадству, што яны сапраўды ўгледзелі ў апошніх кроках беларускага кіраўніцтва нейкія зрухі да дэмакратызацыі краіны. А якія канкрэтна тыя зрухі, акрамя, зразумела, нядаўняга вызвалення палітвязняў, чамусьці ўсе трымаюць у сакрэце.

Ды і ўсход, у выглядзе Расіі з усім сваім газам, нафтай і адным з самых вялікіх войскаў на свеце, таксама аказваецца для беларускага рэжыму не аўтарытэтам. Як не круціўся пасол Расіі ў Беларусі Сурыкаў, каб беларускі рэжым прызнаў незалежнасць Паўночнай Абхазіі ды Асеціі, Лукашэнка адказаў ім проста і надзвычай дэмакратычна — гэта зробіць новы, дэмакратычны парламент! У дадатак да ўсяго гэты парламент будзе прызнаны Захадам, і Захад вымушаны будзе лічыцца з яго рашэннем.

Нават Пуцін так знерваваўся, што вырашыў адразу пасля гэтых выбараў прыляцець у Мінск на размовы і перамовы. Здаецца, ні перад адным кіраўніком аніводнай краіны ён так не губляў сваёй паказной кадэбісцкай цвёрдасці, як перад кіраўніком той Беларусі, якую хацеў бачыць у складзе Расійскай Федэрацыі цалкам або губернямі.

Папраўдзе кажучы, наконт губерні ён сваёй мэты часткова дасягнуў. Памаглі нашы. Бо калі выбаршчыкі Гародні чытаюць агітацыю падчас менавіта гэтай выбарчай кампаніі, то складвалася ўражанне, што яны сапраўды жывуць на тэрыторыі Северо-Западной губерні. Улёткі і агітацыя кандыдатаў выключна на рускай мове, у тым ліку і ў кандыдатаў ад апазіцыі. Здаецца, што выбары праходзяць недзе ў Самары або Ніжнім Ноўгарадзе. Што адбылося ў колах апазіцыі ў горадзе, якая нават на прэзідэнцкія выбары адмаўлялася расклейваць апазіцыйныя матэрыялы па-руску, сказаць цяжка. Можа нашы апазіцыйныя кандыдаты, дачуўшыся, што некага прапусцяць у парламент з апазіцыі, проста канкуравалі паміж сабой за званне больш лаяльнага да курсу і палітыкі існай улады?! У тым ліку і да курсу татальнай русіфікацыі беларусаў! Можа спадзяюцца, што па чыёйсьці вялікай міласці так лягчэй патрапіць у парламент?!

А можа проста зблыталі мэты са сродкамі іх дасягнення. Бо калі мэтай апазіцыі заўсёды была дэмакратызацыя, беларусізацыя і незалежнасць, а выйгрыш у парламенцкіх выбарах расцэньваўся толькі як адзін са сродкаў дасягнення гэтых мэтаў, то зараз усё памянялася месцамі. Мэтай стала стаць дэпутатам. А выбар мовы стаў расцэньвацца як сродак для дасягнення гэтай мэты.

На гэты раз руская мова была вызначана гродзенскімі прэтэндэнтамі на дэпутацкае месца больш перспектыўнай. Засталося толькі высветліць, ці дапаможа ім чужая мова. І чакаць засталося нядоўга. І гэта, і ўсё астатняе, хутка стане вядомым. Выбары пакажуць.

Віктар САЗОНАЎ

Пытанне пра сілу слабасці

Хто ж з нас не захапляўся самой у сабе магутнасцю, энергіяй, сілай; усім гэтым, што папярэджвае пачын, дзеянне, тым, што перамагае, што заўсёды ў авангардзе; што спрычыняецца да таго, што адбываюцца змены, прыкметныя сярод нас ужо на першы пагляд вока? Тое, што кіруе працэсамі вышэй чым адзінкавага маштабу, агульнакраёвага, калі не глабальнага, калі „прамінае лік свету".

Ці памятаюцца нам прарокі, усхваляючыя перамогу сілы, якія яўляліся ў гожым і страшэнным XX стагоддзі, веку таталітарызмаў гэтых як ад правага, так і левага боку, веку знішчальных сусветных войнаў; гэтыя, што абяцалі нам тысячагадовую шчаснасць усім падаючым перад магутнасцю дзяржавы, усім пакорным і напалоханым. А гэты век адыходзіць у нябыт, у распад, у міф; як усё, што было калісь магутным, вялікім, геніяльным.

У галіне літаратурнага мастацтва ці мо прамінулі беспаваротна эпохі вешчуноў, такіх як Міцкевіч, Леў Талстой ці Купала, якія стварыла, якімі захаплялася літаратурная публіка, а нават абажалі іх цэлыя народы, а якія ў штодзённым жыцці няраз праяўлялі чалавечую, таксама архічалавечую дробязнасць.

Як жа геройска, як магутна гучаць строфы твораў Фрыдрыха Ніцшэ, мысляра, што змагаўся з Богам... Тым часам з апублікаваных ягоных лістоў сябрам выхінаецца постаць хворай, слабой, перапалоханай людзіны, якой штодзённае жыццё прычыняла боль і пакуты.

Румынскі мысляр Эміль Чоран звярнуў увагу на факт, што чалавек у дзеянні, чалавек чыну мусіць паводзіць сябе ірацыянальна. Таму што пачын — плод жарсці. Развага, цвярозасць у пачыне — перашкоды. „Не дасца перайсці да пачыну без фанатычнага запалу, без дзікага агню, без мінімуму несвядомасці", — пісаў Чоран.

Хто ж з нас не сутыкнуўся з інтэлектуаламі, якія прагнулі, жадаюць улады, прынамсі ўлады над розумамі, часта ўлады неабмежаванай? Працы Марціна Гайдэгера выклікаюць захапленне — няма такога пытання, праблемы, думкі, якой бы нямецкі філосаф не падаў пранікнёнаму, адкрыўчаму аналізу. Здавалася б, абдумаў, прааналізаваў усё, усе аспекты нашага быцця ў свеце — у кожным выпадку даходзячы на ўскрай бяздоння, нябыцця. Ці то інструмент аналізу, тыя лагічныя шалі спрычыніліся да таго, што выдатны розум адмяніў развагу, забыўся пра развагу, кінуўся ўсляпую, на злом галавы, у пачын, што падтрымаў гітлерызм, сістэму, якая ж пярэчыла ягоным цудоўным роздумам.

Памятаем далучэнне да радыкальных пачынаў, да ўсялякіх рэвалюцый, таталітарызмаў, марксізмаў, тое „наступанне на горла сваёй песні", як вырашыў паэт Маякоўскі, каб аддаць свой талент прапагандзе, марнаму прыкладному мастацтву. Мілыя майму сэрцу французскія паэты-сюррэалісты з ахвотай падтрымалі камунізм у Расіі, некаторыя з іх падтрымалі злачынны сталінізм.

Мабыць, „Капітал" Маркса, пісьменніка ў свой час сапхнутага на абочыну, які вёў нэндзнае жыццё эмігранта, адціснуў большы ўплыў на перамену свету, чым капітал як жа шматлікіх капіталістаў.

Наогул, аднак, схільнасць да аналізу, ці мо самааналізу спрычыняецца да таго, што аціхаюць жарсці, праца аналітыка нагадвае выраўноўванне цярплівым земляробам складкаватай глебы. Інтэлектуальныя аперацыі становяцца летнімі, паніжаюць тэмпературу, паколькі вядуць да таго, каб дасягнуць стан раўнавагі. Гвалтоўны пачын прыстоіць экзальтаванай маладосці; старасць, спеласць — асцярожная, памяркоўная. Мабыць, павінны мы праяўляць пашану спелай рэфлексіі, сцішанаму стылю жыцця, сузіранню. Заадно маладосць як і старасць з'яўляюцца рысамі жыцця, якіх ніяк не ўдасца вывесці, паколькі яны неабходныя.

Хто ж з нас не любіць аддацца лагоднай медытацыі, сузіранню, пагружэнню ў разумныя і прыгожыя кнігі, у творы мастацтва? Хоць сузіранне няслушна асацыююць са слабасцю, вяласцю, паміраннем...

Ежы ПЛЮТОВІЧ

Вачыма еўрапейца

Доўгі шлях?

Нічога не паказвае на тое, каб хутка былі завершаны размовы наконт падпісання дамовы паміж Польшчай і Беларуссю аб малым памежным руху. Напэўна не магло гэта адбыцца да канца верасня, як інфармавала пару тыдняў таму частка польскамоўнай прэсы.

— Сцвярджэнне, што хоць бы апрацоўванне зместу гэтай дамовы будзе завершана да канца верасня на ўзроўні двухбаковых консульскіх размоў, не ўспамінаючы ўжо аб яе падпісанні і ратыфікацыі, з'яўляецца злоўжываннем. Я не хацеў бы дзеля дабра справы называць чысла, — мы пачулі ад аднаго з працаўнікоў консульскага ведамства Міністэрства замежных спраў у Варшаве.

Мы даведаліся пры нагодзе, у чым праблема. Справа тут у шэрагу міжведамственных вызначэнняў. Напрыклад, звязаных з асобамі перасякаючымі мяжу, а якія хочуць лячыць працяглыя хваробы ў асяродках медычнай службы здароўя ў суседняй краіне (беларусамі ў Польшчы і наадварот). Па прычыне адрозненняў у перападліку аплат за лячэнне, марныя шанцы, каб так магло быць. Вядома, ні адзін з негацыюючых бакоў не пярэчыць, што медыцынская дапамога мае надзяляцца, але датычыць мае гэта раптоўных выпадкаў. Няма шанцаў на ўвядзенне медыцынскіх страховак; адпаведнае распараджэнне Еўрапейскай камісіі аб малым памежным руху паміж краінамі ЕС і суседнімі не прадбачвае ўвядзення такіх. Праблемай застаецца пытанне функцыянавання г.зв. тэлеінфарматычнай сістэмы, дзякуючы якой магчымы быў бы пераход інфармацыі паміж Польшчай і Беларуссю калі гаворка аб перасякаючых мяжу ў дыяпазоне гмін ахопленых дамовай. Яна неабходная, каб не наступіў раптоўны і некантраляваны рост міграцыі, але, перш за ўсё, каб прынамсі абмежаваць да мінімуму вынікі падарожжаў г.зв. мурашак. Да таго неабходнай з'яўляецца чарговая навелізацыя закона аб чужаземцах і ўвядзенне ў ім раздзела „малы памежны рух", з запісам усіх вынікаў гэтага наконт асоб, аб якіх у законе гаворыцца. Урэшце неабходным з'яўляецца падрыхтаванне картаў дазволаў (асобы, пражываючыя на тэрыторыі памежнай зоны змогуць ездзіць сюды і назад нават некалькі раз на працягу дня). Польскае МЗС хацела б, каб выглядалі яны як малое, пластмасавае, вядома, з усімі забеспячэннямі, пасведчанне асобы (dowód osobisty) абавязваючае ў Польшчы. Кажуць, што Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі канчае апрацоўванне адпаведнага ўзору і падрыхтоўку да друку.

— Візавая надрукоўка ў пашпарце, якую шматразова прапусцяць праз чытнікі, адносна хутка страціць сваю выразнасць, — сказаў наш інфарматар у МЗС у Варшаве.

Ну і на канец: чаму я сумняваюся ў тым, што хутка будзе ажыццёўлена дамова аб малым памежным руху паміж Польшчай і Беларуссю? Пасля абмеркавання яе зместу на консульскім узроўні, неабходна яе парафаваць, падпісаць прэм'ерамі (хоць могуць гэта зрабіць кіраўнікі ведамстваў замежных спраў) і — паколькі гэта міжурадавая дамова — мусяць яе ратыфікаваць абодва парламенты. У дзень, калі я пісаў гэты тэкст, яшчэ не было вядома, ці міжнародная грамада (ЕС) прызнае нядзельныя выбары ў беларускую Палату прадстаўнікоў, значыць, ці можна будзе, напрыклад, гаварыць аб правамоцнасці дзеянняў гэтага парламента, таксама ў кантэксце якраз ратыфікацыі закона аб малым памежным руху з Польшчай.

І яшчэ адно. Падобная дамова Польшчы з Украінай была прынята абедзвюма краінамі ў канцы сакавіка. Аднак еўрасаюзныя чыноўнікі паставілі пад пытанне яе запісы.

— У гэтай справе не можам выйсці з імпасу. Таму, рыхтуючы дамову з Беларуссю, не можам нарабіць падобных памылак, — запэўнівае працаўнік польскага МЗС.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Нафтабаза ці бомба запаволенага дзеяння?

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Калі 20 верасня газета „Dziennik” напісала, што непадалёк ад вёскі Лясная, распаложанай паміж Нараўкай і Семяноўкай, расійскі канцэрн „Лукойл” хоча на 25 гектарах зямлі збудаваць велізарную паліўную базу, якую складала б прынамсі 20 умяшчальнікаў на бензін, газ і аўтол, а самыя вялікія рэзервуары маглі б памесціць нават па 5 тысяч кубаметраў паліва, у польскіх масмедыях падняўся вялікі шум. Газета біла трывогу: **„Расіяне хочуць кантраляваць польскі рынак бензінных заправак”**, а ў Нараўку і Лясную з'ехаліся журналісты і аператары публічнага тэлебачання і камерцыйных тэлестанцый. Брыгада адной з іх на машыне з тэлеўстаноўкай дабралася нават да месца прадбачванай „экспансіі” расіян і непасрэдна выходзіла ў эфір, паказваючы выказванні войта Нараўчанскай гміны Мікалая Павільча і жыхароў Лясной, якіх паспрабавалі склікаць на сход, запрашаючы таксама жыхароў суседняй Альхоўкі. Паведамленні з Лясной паяўляліся таксама 20 верасня на агульнапольскім радыё і кожную гадзіну перадаваліся па Радыё Беласток. У панядзелак, 22 верасня, на першых старонках беластоцкіх газет паявіліся рэпартажы з сяла Лясная і паведамленні аб планаванай інвестыцыі. Не ведаю, ці столькі ўвагі ў польскамоўных масмедыях адвялося б праекту, які рэалізавала б нямецкае ці французскае прадпрыемства, калі б і была нейкая пагроза для аховы Белавежскай пушчы. Затое думаю, што палітычнага падтэксту не бралі пад увагу экалагічныя арганізацыі, якія выказваліся на тэму магчымых уздзеянняў оптавай нафтабазы на асяроддзе. Стараюцца яны сачыць за новымі інвестыцыямі ў наваколлі Белавежскай пушчы і падымаюць трывогу, калі, паводле іх, праекты могуць пагражаць ахове пушчы. У выпадку планаванай оптавай паліўнай базы побач Лясной іх вельмі крытычныя ацэнкі покі абапіраюцца на тэарэтычныя разважанні.

— Нас акружылі базамі нафты і газу, а тут ізноў мае будавацца вялікая паліўная база. Не ведаю, чаму радныя згадзіліся на новую інвестыцыю. Пазалівалі ў нас нетрывалы асфальт і калі паявіцца многа грузавых машын, дашчэнту паразбіваюць яго, — кажа Таіса Драўноўская з Міклашэва.

— У інвестыцыйным плане „Лукойла” прадбачваецца, што за свае сродкі перабудуе ён і ўзмоцніць некаторыя павятовыя дарогі непрыстасаваныя да транспарту аўтафураў, што таксама будзе мець уздзеянне на выдачу ваяводам станоўчага або адмоўнага рашэння на рэалізацыю інвестыцыі, — пераконвае войт Мікалай Павільч.

Справа аднак не канчаецца толькі на гмінных, ці павятовых дарогах. На ваяводскай дарозе, што ідзе з Навасадаў у Нараўку, на некаторых адрэзках за адной залатанай дзірай знаходзіцца другая залатаная, а па гэтай дарозе ішоў бы, прынамсі першапачаткова, асноўны транспарт аўтацыстэрнаў з газам і аўтолам, калі б узнікла нафтабаза каля Лясной.

Хочуць нам падкласці бомбу

У Лясной мае суразмоўцы аднадушны наконт базы.

— Усе жыхары Лясной супраць гэтай будовы. Людзі распачалі агратурыстычную дзейнасць, новыя асобы таксама ахвотныя заняцца агратурызмам. Ёсць у нас экалагічныя гаспадаркі, а тут раптам такую бомбу хочуць нам падкласці. Раней мы нічога не ведалі, што „Лукойл” хоча будаваць каля нас базу, а толькі 20 верасня па тэлебачанні даведаліся аб гэтым. Пад нашы хаты падыходзілі зубры і лясная звярына, а цяпер канец будзе з гэтым. Нашы сяляне за пенсію аддалі ў дзяржаўнае карыстанне зямлю, а цяпер гмінныя ўлады без нашай згоды прадалі яе пад будову паліўнай базы. Рышард Гапуновіч прадаў найбольш поля для суполкі з Варшавы, якая скупляла зямлю. Зараз заяўляе, што калі б ведаў, што на яго полі ўзнікне нафтабаза, не прадаў бы яго, — кажа солтыс Лясной Ян Вайцяхоўскі.

Войт Мікалай Павільч лічыць, што ўсё адбылося згодна з абавязваючым у Польшчы парадкам.

— Калі радныя памянялі план добраўпарадкавання гміны, ніхто з жыхароў не прыйшоў на кансультацыі, хаця інфармацыя аб іх падавалася на аб'явах і ў прэсе, — кажа нараўчанскі войт. — Інвестыцыяй цікавілася таксама нямецкае прадпрыемства. Я не ведаю ці варшаўская фірма „Хемтанк”, што купляла зямлю каля Лясной, прадала ўжо яе „Лукойлу”. Можа паявіцца і іншы інвестар.

Жыхары Лясной лічаць, што дарога праз іх сяло не вытрымала б вялікай нагрузкі, калі пачалі б па ёй ездзіць велізарныя цыстэрны

Больш працоўных месц

— У нашым сяле можна было б адчыніць вялікую турыстычную базу, з пляцоўкамі для рэкрэацыі і спартыўных гульняў, — дабаўляе солтыс Ян Вайцяхоўскі. — Тут мясцовае насельніцтва таксама магло б знайсці работу.

Радныя, што прагаласавалі за змену выкарыстання зямлі, і жыхары больш аддаленых ад Лясной вёсак, якія падтрымліваюць планаваную інвестыцыю, звяртаюць увагу на магчымыя новыя падаткі і новыя месцы працы.

— Новая інвестыцыя, калі б была рэалізавана, павінна стварыць каля 40 новых працоўных месц і, лічыўшы памяркоўна, даць у якасці падаткаў каля мільёна злотых даходу ў гмінны бюджэт. Аднак яшчэ не вырашана справа новай інвестыцыі і ўсё будзе залежаць ад вынікаў рапарту ўздзеяння яе на акружаючае асяроддзе, — дабаўляе войт Мікалай Павільч.

— Мы ў Лясной супраць будовы базы, але адзін жыхар Альхоўкі перад тэлекамерамі заявіў, што ён за новай будовай, бо можа будуць новыя месцы працы. У базе будуць у асноўным патрэбны кваліфікаваныя кадры, а не мясцовыя людзі без адпаведнай тэхнічнай падрыхтоўкі. Дарогі нам паразбіваюць і невядома, ці будзе бяспечна ў нашай вёсцы, калі пад бокам такія вялікія ўмяшчальнікі пабудуюць, — гаворыць Веслаў Іванюк. — Мая жонка распачала агратурыстычную дзейнасць і ўжо турысты сталі прыязджаць. Хто з турыстаў схоча да нас ехаць, калі паявіцца ў нас нафтабаза. Калі нехта і прыедзе, паглядзіць на рэзервуары і другі раз не вернецца.

У Лясной салідарна гавораць: „мы супраць”.

— Мы супраць будовы новай базы, бо паразбіваюць нам дарогі і небяспечна будзе ў сяле. Ужо і зараз, калі побач вёскі праязджае аўтафура, дрыжыць наша хата, распаложаная побач скрыжавання. Што будзе, калі павялічыцца паток грузавых машын, — з жалем разважае Івона Лушынская, якая разам з мужам побач старой хаты будуе новы дом. — Муж працуе пагранічнікам, але пасля пераходу на пенсію намерваецца распачаць агратурыстычную дзейнасць. Мы ж гадуем таксама коней. Калі ўзнікне база, нельга будзе рэалізаваць такія планы.

Войт Мікалай Павільч заяўляе, што калі ўзнікне паліўная база, не будзе яна знаходзіцца бліжэй, чым 200 метраў ад сяла.

— Прадпрыемства „Хемтанк” купіла таксама луг, што датыкае да плота майго панадворка і прагулкам выходзіць на вуліцу. Маё поле, што пачынаецца за клуняй, распасціраецца паабапал шырокіх рэек і даходзіць да выкупленых пад базу лугоў. Шырокія рэйкі толькі пры дарозе ў Плянту адрамантаваныя, а далей яны так расхістаныя, што цыстэрны могуць сысці ў адхон. Гэтыя рэйкі пралягаюць таксама і праз купленае пад базу поле, а яно амаль будзе абапірацца аб нашу вёску, — заяўляе солтыс Лясной.

У прэсе паявілася інфармацыя, што войт і радныя Нараўчанскай гміны пацыху дагаварыліся з „Лукойлам” у справе будовы аграмаднай расійскай нафтабазы ў Белавежскай пушчы, але войт Мікалай Павільч рашуча пярэчыць гэтаму.

— Побач вёскі Лясная было 9,37 гектара поля, якое было гміннай уласнасцю. Мы аб'явілі ажно тры аўкцыёны і толькі за трэцім разам удалося яе прадаць. Зямлю ў 2006 годзе купіла польская фірма „Хемтанк” з Варшавы, заплаціўшы 439 810 злотых і дэкларуючы, што прызначыць яе пад гандлёвую і гаспадарчую дзейнасць. Гэтае прадпрыемства дакупіла яшчэ суседнюю зямлю ад прыватных гаспадароў і разам сабрала 25 гектараў. У 2006 годзе Рада гміны прыняла інтэнцыйную пастанову аб распрацоўцы плана добраўпарадкавання гэтай тэрыторыі, а ў 2007 годзе план быў апрацаваны і пасля паправак прыняты нашай радай у 2008 годзе. Прадбачваў ён гаспадарчае выкарыстанне раней ворных зямель, — рашуча заяўляе войт Мікалай Павільч. — Да лета гэтага года я не ведаў аб ніякіх кантактах „Лукойла” з прадпрыемствам „Хемтанк”, якое дэкларавала нам, што на купленай тэрыторыі будзе праводзіцца перагрузка і склад розных матэрыялаў, у гэтым ліку і паліваў. Толькі ў ліпені гэтага года прыехаў да нас прадстаўнік канцэрна „Лукойл” і заявіў, што хоча заказаць даследаванне наконт магчымага ўздзеяння нафтабазы на акружаючае асяроддзе. Тады мы і даведаліся, што канцэрнам „Лукойл” прадбачваецца будова на купленай ад нас і нашых гаспадароў зямлі 12 умяшчальнікаў на газ і 4 на паліва, размерам ад 50 да 5 тысяч кубаметраў. Раней мы не мелі ніякіх кантактаў з канцэрнам „Лукойл”.

Небяспека для Белавежскай пушчы

Эколагі паведамляюць, што оптавая паліўная база побач Лясной можа пагражаць пушчанскай экасістэме. Тлумачаць, што на месцы, дзе мела б быць пабудаваная база, знаходзяцца ірыгацыйныя каналы і ў выпадку аварыі такім шляхам можа быць атручана ўся Белавежская пушча. Будуць яны кансультавацца з гідролагамі і прасіць дапамогі ваяводскіх улад, каб правесці свае доследы па магчымасцях шкоднасці інвестыцыі для асяроддзя.

— Купленая і прызначаная пад гаспадарчую дзейнасць зямля знаходзіцца ў адлегласці 5-6 кіламетраў ад Белавежскай пушчы і ў 10 кіламетрах ад Белавежскага нацыянальнага парку і не ляжыць на тэрыторыі „Натура-2000”, што дазваляе арганізаваць там гаспадарчую дзейнасць, — кажа войт Мікалай Павільч. — Аднак, каб можна было рэалізаваць інвестыцыю, трэба зрабіць экспертызу ўздзеяння планаванай інвестыцыі на акружаючае асяроддзе і гэта па прапанове рады будзе праведзена такая экспертыза, а кошты яе пакрые інвестар. На экспертызу, якая, думаю, будзе рабіцца недзе год часу, будуць магчы паскардзіцца эколагі і жыхары гміны, калі будуць з яе незадаволеныя, а ў крайнім выпадку радныя будуць магчы заказаць паўторную экспертызу. У выпадку, калі экспертыза пакажа, што інвестыцыя будзе адмоўна ўздзейнічаць на асяроддзе, не адбудзецца яе рэалізацыя. Канчатковае рашэнне пра будову і рэалізацыю інвестыцыі будзе выдаваць ваявода, а ўзгаданая экспертыза будзе толькі адным з аргументаў для выдачы станоўчага або адмоўнага рашэння, што, думаю, не адбудзецца раней як у 2010 годзе, а пасля яшчэ некалькі гадоў рэалізавалася б інвестыцыя.

Вялікі шум у масмедыях мог напалохаць канцэрн „Лукойл”, а яшчэ ж будуць напэўна пратэставаць і эколагі.

— Я думаю, што эколагі, так як у выпадку Распуды, не дазволяць на так вялікую інвестыцыю побач Белавежскай пушчы і таму зараз мала рэальнай з'яўляецца будова побач Лясной паліўнай базы, — мяркуе гайнаўскі мастак Віктар Кабац, ураджэнец Нараўчанскай зямлі.

Такія меркаванні моцна праўдападобныя, бо дарога, па якой ездзілі б цыстэрны з газам і бензінам, якраз праходзіць праз Белавежскую пушчу і тэрыторыю „Натура-2000”, што можа быць, як у выпадку Распуды, прычынай для адмоўнага рашэння ваяводы ў справе базы побач Лясной. Можна ж гэтыя ўчасткі яшчэ прадаць нейкаму, нават і расійскаму бізнесмену, што будуе гатэлі, і збудаваць каля Лясной турыстычную базу.

За „Ніву” трымалі на мяжы 6 гадзін

25 верасня на памежным пераходзе Бабраўнікі-Пагранічны быў затрыманы сябра Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады (БСДГ) Віктар Дзесяцік. Грамадскага актывіста трымалі на мяжы ажно 6 гадзін. Прычынай таму сталі выяўленыя ў машыне **Віктара Дзесяціка** газеты. У выніку ў яго сканфіскавалі 40 асобнікаў газеты „Ніва” — тыднёвіка беларусаў Польшчы. Дзіўна, што мытнікам і спецслужбам падалася крамольнай афіцыйная газета на беларускай мове, якая раней свабодна прадавалася ў кіёсках гарадоў Беларусі. Трэба зазначыць, што за апошні месяц ужо каля дзесяці грамадска-палітычных актывістаў Гродзеншчыны падвяргаліся на мяжы асабістаму дагляду. **Вясна**

Кансультацыі

29-30 верасня адбыліся ў Варшаве чарговыя польска - беларускія консульскія кансультацыі. Беларускую дэлегацыю ўзначаліў начальнік консульскага аддзялення МЗС — Андрэй Гіра, польскую Анджэй Ясяноўскі. Мэтай сустрэчы было дапрацаванне праекта дамовы паміж урадамі Польшчы і Беларусі наконт памежнага руху. Абмяркоўвалася таксама праблема выдачы доўгатэрміновых нацыянальных візаў і другія консульскія пытанні.

Пасольства Рэспублікі Беларусь у Польшчы

Прызабытая дарога

На 2,5 кіламетровым адрэзку дарогі - гравейкі ад ваяводскай шашы Нараўка — Новае і Ляўкова — Бандары ў напрамку Лешукоў у нараўчанскай гміне ёсць месцы дзе едзецца як па валкаўніцы. А цяпер восенню ў выбоінах поўна вады. Увесь час дарога становіцца ўсё вужэйшай і вужэйшай, а абочыны зарослыя. Кусты значна абмяжоўваюць відавочнасць і робяць яе надта небяспечнай. Шкада, што ўлады Нараўчанскай гміны не паклапаціліся пра гэтую дарогу. Не маюць часу за важнейшымі справамі да вырашэння. Як тутэйшаму жыхару хочацца мне каб войт паслаў грэйдэр на гэтую прызабытую ўсімі дарогу, на якой даволі вялікі рух. **(яц)**

Мікалай ЛУК’ЯНЮК

Сумна

Ой, як сумна ў хаце, –
Адзінокаму астацца,
Што пачнеш рабіці,
Нічога не ўдасца.

Радня разышлася
Па ўсенькім свеце
І свой клопат маюць,
Як кожныя дзеці.

Старэнькія бацькі
Адны пааставаліся,
Калі яшчэ ўдваёх, –
Весялей трымаліся б.

А калі ўжо аднаму
Прыходзіцца жыці,
Жаль сціскае сэрца,
Няма з кім гаварыці.

І так засумуеш
Над сваёю доляй,
Што ты ўжо астаўся
Круглым сіратою.

Дзядзька Кастусь з Крушынян

Міра ЛУКША

Кастусь Пятэльскі (справа) з сынам Янкам, 15 красавіка 1990 г., на Вялікдзень

Калісь у „Ніву” прыязджаў як на свята невялічкі чалавек, пры якім не бачылася яго росту. Гэта быў госць з Крушынян, Крынкаўскай гміны, чытачам вядомы як дзядзька Кастусь, Канстанцін Пятэльскі, карэспандэнт і час ад часу паэт. А гэты невысокі чалавек быў не такі і невялікі! Вядомы ён быў як грамадскі дзеяч, радны, каваль, пажарнік, да таго і цудатворца! Падкаваў ён не аднаго каня, наладзіў не адзін плуг і воз у наваколлі Крушынян, паставіў на ногі не аднаго чалавека. Замаўляў ружу, выводзіў з людзей цяжкія нямогласці, з якімі не давалі рады дахтары і іншыя народныя лекары. Калі канчаў свой век, сам страціў уладу ў нагах. Пабраў нямогласці іншых на сябе, і фізічныя, і духовыя, аддаў сябе людзям гэты чысты і праведны чалавек з вёскі Крушыняны. Таму яго памятаюць у роднай вёсцы Пятэльскіх — Крушынянах, якая — на ружы вятроў з усходу і з захаду. Пра яе кажуць, што яна — вёска чатырох культур. Прыедзеш у яе цяпер у людны фэставы дзень і не ведаеш, хто тут тутэйшы беларус або татар, а хто прыезджы.

Ідучы да дзядзькі Кастуся Пятэльскага, пра якога ведаем, што няма яго ўжо ў жывых, распытваю пра яго сям’ю ў шматтысячным тлуме гасцей, што прыехалі на татарскі уікэнд. Там хто гуляе, хто будуе студню ці рамантуе прыгожыя хаты. Не ўмерлі Крушыняны, прынамсі ў святочны летні дзень. Усё ж з тлуму вылаўліваю тутэйшых. А яны і кажуць: жыве ў Крушынянах старэнькая жонка дзядзькі Кастуся Галена, і сын Янка з дачкою Рэняй (Ірынай) прыязджаюць яе даглядаць. А дзе іхняя хата? А там бліжэй пачатку, крыху воддаль ад дарогі, кажуць. Найпрасцей накіроўвае мяне ў той бок гожы старэнькі дзедка, таксама Пятэльскі, дзядзька Тадзя, католік, так як і Кастусёва жонка. Бо сам дзед Кастусь быў праваслаўны, адзначае старажыл на драўлянай назе. І праўда, у глыбіне зялёнага падворачка бачу акуратны дом. Толькі такі мог паставіць дзед Кастусь! Хата нумар 27.

З нейкай нясмеласцю стукаю ў дзверы дома Кастуся Пятэльскага. Не ведаю чаму, на парозе мая рука сама мае ахвоту перахрысціцца! Чуецца дабрыня, чысціня, праведнасць. Запрашаюць мяне. У кухні завіхаецца маладжавы снеды мужчына ў ізумурдавым спартыўным касцюме. Сын дзядзькі Кастуся рыхтуе абед сваёй нямоглай матулі. І без ніякіх цырымоній прапануе мне гарачую свежаспечаную аграмадную каню: „А ты як якая свая!” — мяркуе, бо і праўда — мы ж сваякі, калі Янка Пятэльскі — сын ніўскага дзядзькі! І ідзем да цёткі Галены, велічнай жанчыны з суворым тварам, на якім не бачна маршчын, што спачывае на балесным ложы. Так як і Кастусю, пасля смерці мужа адняло ён ногі.

— Ну, то добро, што прыйшлі, — кажа Янка. — А што добраго чуваць у вас у „Ніве”? А вось гэтыя вялікія здымкі рабіў Міхась Хмялеўскі, на Вялікдзень прыехалі былі ніўцы ў Крушыняны. Пісалі тады ў „Ніве”, што і іншыя вёскі, што расселіся на Сакольскіх пагорках, ідуць за Крушынянамі, дзе заснаваны быў народны тэатр.

— Мой Костусь меў столькі энергіі! Навукоўцы дзівіліся — нават прылады для яе мерання гэта выказвалі. І калі хто не даваў рады вылечыць каго з якой нямогласці, казалі: „Едзьце да Каваля!” — на гожым велічным твары пані Галены, якому прыстоіць іконна-славянскае „ліцо”, расквітае ўсмешка. — І засталася я адна. Дбаюць пра мяне мае харошыя дзеці. Добры ў мяне быў муж, добрыя дзеці. Чуццё ў нагах маю, ды не ведаю, чаму не магу ўстаць ды ісці. Былі мы малыя, дык і на хадулях бегалі, а цяпер вазьмі на старасць ды на кулях пайдзі! А гляньце на гэты здымак! — паказвае за спіну на вялікі здымак у зашклёнай раме, што вісіць над яе ложкам. Дата на ім надрукавана — 1938 год. На ім рады стройных юнакоў у пажарнай форме. — О, тут пажарнікі нашыя, з нашага краю, добраахвотнікі. Вось тут мой монж, а тут настаўнік, што нас вучыў. Яманьку, здымі яго пані, хай бліжэй пабачыць. О, жывем тут у Крушынянах. Хацелі Амерыкі, Амерыка сама прыйшла. Невядома што будзе. Нават у зямлі людзей хаваць не будуць, па-божаму. А так тут добра было. Татары насупраць жылі, Талькоўскія... А сустрэліся вы з такім паэтам, як Пятрусь Макаль, ад нас ён?..

— Ой, было калісь тут добра, калі тата жыў, мама былі на ходзе... — уздыхае Янка. — Жыць не ўміраць у Крушынянах! Цяпер цяжка. Я сам пенсіянер, і гаспадарку трэба дагледзець, каб татава старанне не змарнавалася. Я сяджу тут месяц, на другі прыязджае Рэня. Гэтыя ножкі не могуць хадзіць, а колькі яны папанасілі, папахадзілі! — з чуласцю кранае матуліну руку Янка. — Працавалі мы тут з татам і на гаспадарцы, я і брат. Тата працаваў таксама ва „Ухвытах” у Беластоку, быў і прафсаюзным дзеячам. Быў вялікім аматарам кніг, не шкадаваў грошай і на прэсу. Пакінуў вялікую бібліятэку. У шпіхерыку засталося колькі старых часопісаў. Узнагародзілі яго шматлікімі медалямі, крыжамі і ордэнамі за грамадскую службу. За ўдзел у ваеннай абароне краіны, за пажарніцкую справу, за грамадскую апеку, за прафсаюзную дзейнасць... Не быў членам партыі, але і партыя яго ўшанавала. Уратаваў шмат людзей і іх маёмасці як пажарнік. Быў ён чалавекам сумленным і нікога не пакрыўдзіў. Выхаваў і нас на сумленных людзей. А лічыўся ён вялікім аўтарытэтам таксама ў галіне літаратуры. Прыносілі да яго свае вершы тутэйшыя людзі (бо ўсе беларусы такі паэтычны народ!), пыталіся, ці добра ім удалося напісаць, ці варта гэта высылаць у „Ніву”. „Насупраць Анцукавага двара жылі два сякратара!” — пісаў наш сусед, і тата абмяркоўваў з аўтарам ягоны твор. — „Адзін хворы-нездаровы, а другі пасе каровы!” І да гэтых тэкстаў тата адносіўся беражліва, падтрымліваў аўтара, даваў парады.

Як было з тою Кастусёвай моцай? Замаўляў хоць бы ружу. Трэба было тры разы замаўляць. На другі дзень пытаецца ў адной кабеты: „Чаму вы не прыйшлі?” А баба ляціць з сярпом на поле: „А чаго, ужо нічога няма!” Хлопец з Ласінян упаў на ногі, не мог хадзіць. Шаптха не магла памагчы, сказала: „Я гэтага не выцягну. Едзьце да Каваля!” Прывезлі яго ў Крушыняны. Кастусь замовіў. Назаўтра хлопец сам зышоў з воза і прыйшоў да свайго доктара-каваля. Дагэтуль ставіць ён на магілцы Кастуся Пятэльскага свечку.

— Той энергетычны патэнцыял адчувалі нават электронныя прылады, — расказвае Янка. — Калі мне балеў жывот, хапіла, каб бацька прыклаў руку, боль адразу мінаў. Да таго наш бацька быў чалавекам з выразнымі маральнымі прынцыпамі. Сумленная праца, спрыянне людзям, разумная развага, дараванне правін. Іначай — ці ж Бог даў бы яму вяртаць здароўе людзям? Ды і яго змагла нямогласць.

— Мы з бацькам плавалі былі ў Свіслачы. Вельмі ж хацелася тату паплаваць, пераплысці раку. Гэта было ў жніўні. І адняло пасля яму ногі, ужо ў верасні. Калі не даў рады хадзіць, майстраваў пры розных прыладах, каб уставаць, хадзіць, даваць рады пры сабе.

Памёр Кастусь Пятэльскі у 1994 годзе, пражыўшы 87 гадоў. Адышоў ноччу, ціха. Ды моцна стаяць ягоны пекны дом, адмысловыя іншыя пабудовы, растуць дрэвы, жыве памяць сярод людзей.

Кастусь ПЯТЭЛЬСКІ

З верша-адказу Дзядзьку Квасу:

... Пішыце вы, дзядзька, смела,
Што на сэрцы набалела;
І, як кажуць, адмыслова —
Вы вялікі мастак слова.
Кіньма тады ўсе нягоды
І падайма руку згоды.
Я ўжо сівы і вы сівы —
Трэба нам пажыць для „Нівы”!

11.11.1979

Абы зрабіць дах, і гэтага нашым людзям хопіць, — кажа солтыс Уладзімір Тамчук

Хочуць таксама мець сваю святліцу

Тэкст і фота Міхала МІНЦЭВІЧА

У Арлянскай гміне 22 салэцтвы, якія ахопліваюць 25 вёсак. Не ва ўсіх ёсць святліцы ды магчыма, што будзе іх яшчэ менш. Цяперашні войт Пётр Сэльвесюк з самага пачатку сваёй працы на гэтай пасадзе палічыў прыярытэтам рамонты, мадэрнізацыю і нават пабудову ад асноў вясковых святліц. Такі падыход да гэтай справы падтрымлівае большасць радных. Аднак аказваецца, што такія рашэнні не даспадобы ўсім жыхарам, асабліва тады, калі такім чынам іхняй святліцы наканоўваецца гібель.

Святліцы важныя ў вясковым жыцці. У мінулым адбываліся ў іх розныя сходы, выбары, танцавальныя і вясельныя забавы. З ходам часу, калі і вяскоўцы сталі ладзіць свае вяселлі ў гарадскіх рэстаранах і не чуваць пра вясковыя забавы, святліцы атрымалі новую, сумную ролю — у іх сталі ладзіць памінкі. У Орлі, напрыклад, памінкі адбываліся ў будынку пажарнага дэпо, а з часу, калі тамашнюю святлічную залу заняў Інтэрнэтны адукацыйна-асветны цэнтр з камп'ютарамі, трызны сталі ладзіць у гаражы без акон. Да таго ж у гаражы холадна і з часу, калі школа атрымала магчымасць самастойна зарабляць грошы, памінкі сталі ладзіць у школьнай сталовай.

Вось так, раней вясковыя святліцы служылі галоўным чынам моладзі, то цяпер яны прыцягваюць увагу старэйшых асоб, бо туды пасля іх смерці збяруцца людзі на памінкі. Таму многіх бударажыць такое рашэнне, калі ў Арлянскай гміне важнейшай ад неабходнага рамонту справай лічыцца мадэрнізацыя яшчэ добрага святлічнага будынка і нават яго абсталяванне. Так менавіта маюцца справы ў Москаўцах, дзе ў святлічным будынку пачаў валіцца дах, ад снегу і дажджу напралёт прагніла столь, а жыхары вёскі трацяць надзею на рамонт сваёй святліцы, хаця патрабаванні ў іх невялікія — каб толькі дах.

На сесіі арлянскай Гміннай рады 23 красавіка г.г. выступіў солтыс Москаўцаў, 75-гадовы Уладзімір Тамчук, які гэтую функцыю выконвае ўжо амаль трыццаць гадоў:

— Пра святліцу ў Москаўцах была гаворка ці пра рамонт, ці пра знос, бо яна штораз больш руйнуецца, сітуацыя нецікавая.

Солтысу адказаў войт Пётр Сэльвесюк:

— Я быў абяцаў, што гэтае пытанне пастаўлю пад развагу радных. Завалена там палова даху. І мы разважалі што з гэтым зрабіць. Рамонт даху будзе каштаваць 12-13 тысяч злотаў. Калі наладзіцца дах, дык трэба зрабіць і рамонт усярэдзіне, трэба адрамантаваць дзверы і вокны, а перад усім столь, сцены і падлогу — усё гэта будзе патрабаваць некалькіх дзесяткаў тысяч. Але Москаўцы ад Вулькі-Выганоўскай адлеглыя на якіх 300-400 метраў. Прадалі мы школьны будынак у Вульцы-Выганоўскай і дамовіліся з жыхарамі гэтай вёскі, што пабудуем там, насупраць крамы, святліцу. І я вось размаўляў з раднымі ці ёсць сэнс расходаваць грошы на тую святліцу ў Москаўцах, ці больш сродкаў прызначыць на новую святліцу, якую трэба пабудаваць у Вульцы-Выганоўскай. І радныя прыйшлі да высновы, што калі вёскі блізка сябе, то лепш пабудаваць адну добрую святліцу. Такі быў погляд большасці радных і такая пастанова была прынята, — заявіў войт.

Я, як радны і карэспандэнт, каб пабачыць як справы сапраўды маюцца, з'ездзіў у жніўні ў Москаўцы. У тамашнім салэцтве (разам з вёскай Круглае) пражывае каля шасцідзесяці асоб. Гэта ціхае салэцтва, на ўікэнды прыязджае сюды шмат гарадскіх сем'яў. Спытаў я солтыса, Уладзіміра Тамчука, пра святліцу, ці яна патрэбная вёсцы.

— Святліца нам вельмі патрэбная. Будынак святліцы быў прыватны, яго ўладальнік жыве ў Бельску, але прэтэнзій на будынак не мае: „Няхай гміна робіць з ім што хоча". Калісь у гэтым будынку быў паштамт, пасля размясцілася там геэсаўская крама (спадар Тамчук быў у ёй прадаўцом на працягу дзесяці гадоў, а пасля яшчэ тры гады ў такой жа краме ў Вульцы-Выганоўскай — М. М.), пасля будынак пераняла гміна і стаў ён вясковай святліцай, дзе ладзілі сходы і забавы. У тым часе людзі самі яго рамантавалі, дапаўнялі чарапіцу, усярэдзіне абабілі сцены панэллю. Аднак будынак патрабаваў больш грунтоўнага рамонту, а гэтага не было каму зрабіць і будынак пачаў гніць. Я пра гэта заяўляў у гміну, прыязджалі і гаварылі: „Ох, гэта ўсё кошты-кошты, можа ў наступным годзе будзе большы бюджэт..." І так асталося аж пачаў валіцца дах.

— Я, як радны, — кажу солтысу, — ведаю, што ад двух гадоў гэтага склікання на ўсялякія рамонты і мадэрнізацыю вясковых святліц у Арлянскай гміне прызначаюць нават і вялікія фінансавыя сродкі.

— Войт сказаў нам: „Шукайце майстра, няхай ацэніць і заплачу". Знайшлі мы майстра з Залешан, які хаты стаўляе. Навесну прыехаў ён, аглянуў будынак, згадзіўся рабіць; мы паабяцалі, што яму паможам. Паехаў ён на склад, згадзіў драўнінны матэрыял, і ацаніў рамонт на трынаццаць тысяч злотаў. Мы згадзіліся высечы дрэва, што расце побач святліцы і перашкаджала б у працы — нас жа ёсць у вёсцы некалькіх мужчын. Войт спачатку згадзіўся адрамантаваць будынак, пасля стаў гаварыць, што кошты завялікія (у іншых вёсках рамонты святліц каштавалі ў некалькі разоў больш — М. М.) аж сказаў, што пабудуе святліцу ў Вульцы-Выганоўскай і туды будзем хадзіць. Ну, але хто ад нас пойдзе ў Вульку-Выганоўскую, калі няма каму хадзіць на сходы ў сваёй вёсцы? Дагэтуль сходы ў Москаўцах з мусу адбываліся ў прыватнай хаце. А ў прыватную хату не кожны хоча хадзіць, а ў сваю святліцу пайшлі б.

Паводле войта 13 тысяч гэта замнога. А па-мойму, калі б і дваццаць тысяч трэба было, дык колькі ж гэта? Але будынак стаяў бы. Ужо нашы жыхары крыўдзяцца, што ўсюды рамонты, а ў нас нічога, што Москаўцы і Вульку крыўдзяць, бо ж і ў Вульцы-Выганоўскай нічога не робіцца. Прадалі пасляшкольны будынак у Вульцы-Выганоўскай і на вясковых сходах адны былі за пабудовай святліцы, а іншыя за купляй пажарнай машыны і нічога не атрымалася. (Паводле вульчанскага солтыса Юрыя Васілеўскага вяскоўцы прагаласавалі за пабудову святліцы — М. М.) То няхай Вулька, калі так хоча, купляе сабе пажарную машыну, а ў Москаўцах хай давядуць святліцу да парадку і няхай жыхары Вулькі-Выганоўскай сходы ладзяць у нас. За продаж школы ўзялі 75 тысяч і цяпер, падобна, замала гэтага і на машыну, і на святліцу. (У Вульцы-Выганоўскай святліца мае быць пабудавана ад падмурка, матэрыял мае быць са зносу нейкай хаты — М. М.)

У Градалях, напрыклад, войт адрамантаваў добры будынак, даў абсталяванне і цяпер там адбываюцца памінкі. І гэта вельмі добра. І ў Шарнях адшыкаваў святліцу, у Пашкоўшчыне. (У Рудутах, Кашалях, а ў найбліжэйшых планах з фондаў Зінтэграванай праграмы рэгіянальнага развіцця чакаюцца 45 тысяч на мадэрнізацыю святліцы ў Шчытах-Навадворах і аж 165 тысяч на Крывятычы — М. М.) А ў нас то нельга зрабіць? — пытаюць людзі. Папракаюць мяне, солтыса, быццам я пра гэта нічога не гавару. Але я ўжо пачынаю трацiць надзею на размовы, бо і са старшынёй Гміннай рады таксама гаварыў.

Прыязджаюць да нас, у Москаўцы, чужыя людзі і пытаюць: „Ёсць у вас святліца?". А я адказваю: „Ёсць! Пагляньце як гніе". У святліцы падлога яшчэ можа быць, ёсць вокны, галоўныя дзверы салідныя, абабітыя бляхай, бо ж раней тут крама была. Важна, каб тут дах зрабіць і нашым людзям гэтага хапіла б. Ужо і злосць мяне бярэ. Ездзяць людзі па іншых вёсках, бачаць і гавораць: „Усюды дае грошы, усюды робіць, а тут не можа!?" Памажыце, памажыце нам! — вельмі шчыра просіць мяне засмучаны солтыс Уладзімір Тамчук.

Анна Шпакоўская

Чорная Вёска, Залатая Вёска, Рудая Рэчка

Легенду, якая гаворыць аб маёй вёсцы і найбліжэйшых ваколіцах, я пачула ад бабулі, калі я была яшчэ дзіцём. А бабця расказвала так:

— Некалькі стагоддзяў таму адзін з літоўскіх князёў, што любіў паляванні і пушчанскія прыемнасці, рашыў заглыбіцца ў агромністыя бары (якія сёння належаць Белавежскай і Кнышынскай пушчам), каб пераканацца як далёка яны даходзяць. А выбраўся ён на паўднёвы захад.

Перыяд паляванняў пачынаўся позняй восенню, калі на звярах было добрае зімовае футра. Хацеўшы пакарыстацца прыгожай асенняй парой, выбраўся той князь у паход з усёй сваёй світай. З харчамі не было цяжкасцей, бо і коней было чым папасвіць, а і сабе ўпаляваць у лесе звяра.

Абыходзячы агромністыя бары, натыкаючыся на розныя натуральныя перашкоды ў выглядзе багнаў і струмянёў, позняй восенню дайшлі яны да нашага старонння. Зноў нарваліся на багны, з якіх брала выток рэчка. Вада ў ёй была цёмная — не было відаць дна — ды добрая. Назвалі тую рэчку Чорнай і рушылі з яе плынню. Дайшлі да ваколіцы, дзе канчаўся лес, пачыналіся палеткі і немалое паселішча. Жыхары паселішча займаліся вырабам посуду, дахоўкі і іншых рэчаў з гліны. Князь са світай былі цешыліся — маглі адпачыць, запасціся ў корм для коней і страву для сябе. Маглі аддыхнуцца і збірацца ў дарогу назад, бо ж набліжаліся Каляды. Гэтыя святы князь рашыў правесці дома, адпачыць, а пад канец зімы рушыць зноў. Падганяла яго цікаўнасць: калі дайсці яму да канца лесу, якія людскія сялібы ўбачыць. Ад'язджаючы, князь назваў безыменнае паселішча Чорнай Вёскай, ад рэчкі Чорнай, якая сюды іх прывяла.

Зіма была цяжкая, марозная, снежная ды да таго працяглая. Нецярплівы князь рушыў, калі яшчэ ўсюды ляжаў снег, а каляндарная вясна ўжо была блізка. Хацеў дабрацца ў тыя бакі, куды даехаў быў восенню і рушыць далей. Снег, які раставаў, і топкая тэрыторыя прымусілі збочыць яго з абранага шляху. Натрапілі на агромныя багны, залітыя ў некаторых месцах ржавай вадой. З вялікімі цяжкасцямі перабрылі гэтыя багны і дабраліся да месца, дзе жылі людзі. Не было гэта вялікае паселішча, адно пара хатаў паміж дрэвамі, дзе жылі людзі, апрацоўваючыя зямлю выдзертую ад лесу, якія карміліся тым, што далі ім зямля і лес.

Князь, стомлены вандроўкай праз багонны лес, назваў маленькае паселішча Рудая Рэчка. Раздумваў: чаму вада ў багне і ў патоку, які з яе выплывае, такая рудая і на ёй такія тлустыя плямы: ці не ад зямнога алею, а, можа, ад жалезнай руды?

Каля Рудой Рэчкі былі раскінуты тры гаспадаркі. Жылі тут роды з трыма прозвішчамі. Кожны род дбаў аб свой быт, каб сям'я развівалася, была шматлюднай і згоднай. Князь жартам назваў гэтыя тры сем'і Златорыяй, бо згода ў сям'і і яе развой — золата. Былі гэта роды Бучынскіх, Вільчэўскіх і Сікорскіх. (...)

Князь быў рады, што ўдалося яму дайсці да мэты і назваў гэтае паселішча Залатой Вёскай.

пераклала Міра Лукша

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

(Расці з кніжкай)

КНІЖКА, ПА ЯКОЙ МОЖНА ГУЛЯЦЬ З БАЦЬКАМІ!

Дарагія сябры!

Нашы ранейшыя кніжныя прапановы адносіліся да старэйшага чытача ды дзяцей якія разумеюць беларускую мову і ўмеюць чытаць. Сёння прапануем вашай увазе кніжачку для дзяцей малодшага і дашкольнага ўзросту. Яе прачытаюць вам бацькі, настаўнік або старэйшыя сябры. А вашай задачай будзе ўзяць у рукі каляровыя алоўкі і размаляваць нашых казачных герояў. Паслухайце! Гэта не звычайныя героі. Яны жыхары мораў і акіянаў. Каго толькі тут не сустрэнем: тут медуза і марскі конік, крэветка і малюск, акунёк і дэльфін, лятучая рыба хейлапагон і каракаціца, марская зорка і марскі вожык... Усе персанажы прадстаўлены на малюнках, якія вы павінны пафарбаваць (калі будуць сумненні — ёсць узор!).

Вядома, самы цікавы галоўны герой казкі, які за адвагу і спрыт мае мянушку „Какос Маракос". Сапраўды, гэта не рыба і не птушка а найпраўдзіўчшы ў свеце какос, які па сваёй дарозе перамагае ўсе *бітвы* і перашкоды, пакуль не трапіць на сваю выспу і вырасце там прыгожай пальмай.

Дзякуючы кніжачцы-фарбаванцы вы вывучыце жыхароў марскога свету. Але не толькі. Казку можна „сыграць" на ролі. Паслухайце, якую файную гульню прапануе вам сам аўтар.

Кожны эпізод казкі можна іграць па ролях. Напрыклад, дзіця -Какос Маракос — прамаўляе: „Какос Маракос, шпарчэй плыве сваім шляхам далей", — і бяжыць у іншы пакой. А мама ці тата, дзед ці бабуля, граючы ролю Акулы, Рыбы-пілы, Ската і г. д., даганяюць яго. Але Какос Маракос самы моцны! Вельмі весела, калі Какосам Маракосам будзе хтосьці з бацькоў, а сынок ці дачушка — злоснымі акуламі якія даганяюць Какоса...

Кніжачку можна набыць у Беларусі або выйграць у „Зорчыным" конкурсе крыжаванак.

ЗОРКА

Мінскевіч Серж — Прыгоды Какоса Маракоса — СТАА „Медісонт", 2007

Як бачаць нас дзеці з Орлі?!

Хрышчэнне ў спасапраабражэнцаў

Я, як рэдактар „Зоркі", часта праводжу гутаркі з дзецьмі і маладымі. Мяне захапляе іх шчыры і свежы погляд на жыццё. І пытанні, якія ставяць мне дзеці — напрыклад, ці ведаю іхняга дзеда або сваяка?! Для дзіцяці сям'я і дом — гэта айчына і цэлы свет. Таму Пётр Нестаровіч, аўтар і пастаноўшчык фільма „Руская полька", сваёй *айчыны* пачаў шукаць з дапамогай дзяцей. Яго род выводзіцца з Орлі каля Бельска. І менавіта, вачыма і сэрцам дзяцей, рэжысёр знаёміць гледача з культурай і асаблівасцямі нашай зямлі. Першая і самая адметная рыса, гэта рэлігійная мазаіка. Разам з галоўнай гераіняй Юстынай мы пабываем на святой Гары Грабарцы, пазнаёмімся з яе класным сябрам, які прыслугоўвае ў мясцовым касцёле, наведаем хрышчэнне спасапраабражэнцаў у недалёкіх Дубічах-Царкоўных. Пасля завітаем яшчэ ў Школу іканапісу ў Бельску і наведаем знахарку з недалёкага Парцава....

У Іканапіснай школе

Можна сказаць што такая прэзентацыя „мясцовых асаблівасцей" робіцца пад турыстаў. У фільме ўразіла мяне аднак іншая справа. Маладыя героі — дзеці з пачатковай школы ў Орлі — паводзілі сябе як старыя. Я маю на думцы наш характар, які найбольш кідаецца ў вочы наведвальнікам. Арлянскія дзеці, як і іх бабулі або дзяды, вельмі адкрытыя і сардэчныя для прыезджых. Калі яны гавораць пра іншыя рэлігіі, адчуваецца сапраўдная пашана і талерантнасць. Яны прагнуць каб усім на свеце было добра! Яны самі добрыя, шчырыя, праўдзівыя. Сапраўды, самай адметнай і характэрнай рысай жыхароў нашых вёсак і мястэчак, — дабрыня. Гэта заўважылі многія падарожнікі і этнографы ўжо ў мінулых стагоддзях. І мы павінны гэта ведаць і гэтым ганарыцца!

Чытача можа звесці з панталыку загаловак фільма „Руская полька". Гутарка тут не пра Юстыну, толькі пра танец „польку", які ў Орлі і наваколлі лічаць сваім, значыць „рускім". Тут слова „рускі" не адносіцца да нацыянальнасці, толькі ўсходніх уплываў у культуры. А кім адчувае сябе наша гераіня? Не цяжка дадумацца. Юстына разам з сябрамі сустракаецца на ўроку беларускай мовы і спявае „Чараўніцу"!

На ўроку ў рэгіянальнай ізбе

Першая афіцыйная прэзентацыя „Рускай полькі" адбылася 20 верасня ў Орлі, у будынку сінагогі. На сустрэчу з гледачамі прыехаў сам Пётр Нестаровіч. Ну і, вядома, нашы маладыя акцёры!

Фільм варта запрэзентаваць у кожнай нашай школе. Дадатковым атракцыёнам можа быць сустрэча з маладымі акцёрамі. Яны самі раскажуць вам больш чым пабачыце ў фільме....

ЗОРКА!

Міра ЛУКША

Вавёрка з Нью-Йорка

Шэрая Сквірэлька — зорка
З вавёрак роду, жыхарка Нью-Йорка,
У Бялкі прыехала ў госці да Міколы
Лук'янюка (такі там дзед вясёлы
Жыве з бабуляй Оляй на пачатку вёскі).
Сквірэльку пачастуюць усе Бялкі,
А потым вышлюць у іншыя бакі.
Падасца чужаземка ў Кашалі.
Ці вы таксама ў Кашалях былі,
У Арлянскай гміне? На вавёрчын скок,
Як кажуць у Амерыцы, у той бок
З Нарваўскай гміны, што вёсачка Бялкі.
Так як і ў нашай, рыжай, крок такі.
Наведае жывёлак ды людзей
І ў Еўропу рушыцца далей,
А потым праз усю Азію кругом
Сквірэлька дабярэцца ў свой дом.
Аўтограф усім пакіне. Вось вавёрка,
Актрыска шэрая аж з самага Нью-Йорка!

Вершы Віктара Шведа

Латічная размова

Бабуля просіць:
— Мой сынок,
Перавядзі
На другі бок.

— Будзе зялёнае
Якраз,
Перавяду
Тады я вас.

— На зялёнае
Прасіць дарма.
Я перайду
Тады сама.

Дзіўная школа

Адазваўся ў хаце Мікола:
— Надта дзіўная
нашая школа.
Слаба настаўнікі адукаваны,
Таму што пытаюць
нас пастаянна.

І пастаянна трацяць надзею,
Бо мы на пытанні
адказваць не ўмеем.
Ды як адказаць мы можам
як следуе,
Калі сапраўды мы нічога
не ведаем.


Фота Ганны Кандрацюк

ГІСТОРЫЯ ПРА АПОШНІ БУКЕТ У МАЎКЛІВУЮ ВОСЕНЬ

Сваю новую гісторыю я знайшоў нечакана: яна ляжала пад жоўтым лістом, што зляцеў з маладога клёніка і застаўся ляжаць нерухома ў мокрай траве залатога кастрычніка. Гэтак жа нерухома лёг той лісточак сярод белых аркушаў на маім пісьмовым стале, а ў пакоі раптам пачулася...

— Мілы! Ты прыйшоў! Ты ўсё-такі прыйшоў, як і абяцаў!.. — радасна ўсклікнула Ганначка насустрач Тодзіку, калі той пераступіў парог.

— Я заўсёды выконваю свае абяцанні, — цішэй, чым звычайна, прамовіў Тодзік.

— Але ты гаварыў, што па абедзе. А на вуліцы ўжо цёмна... — лёгкім сумам успыхнулі дзявочыя шчочкі.

— Так, спазніўся. Прабач, — прагучала гэтак жа ціха, амаль нячутна.

— Ты нешта хаваеш? Гэта для мяне? — заўважыла раптам Ганначка, што Тодзік трымае адну руку за спінаю.

А яшчэ заўважыла крыху бездапаможны пагляд ягоных не такіх сёння светлых вачэй, крыху нервовыя рухі не такой сёння ўпэўненай постаці...

— Так, для цябе. За маё спазненне.

Юнак працягнуў Ганначцы вільготны, прыгожы, ашчадна падабраны букет непаўторных восеньскіх кветак. І гарэў у руках дзяўчыны кастрычніцкім полымем, адбіваўся ў вачах садовымі шматграннымі фарбамі, наталяў чыстыя думкі крохкасцю белых бутонаў, што пакрысе раскрываліся, нібы аблачыны над пералескам.

— Я пайду? — якім бясконцым самотным золатам струменіўся пагляд Тодзіка! Нібы хацеў яшчэ нешта сказаць, ды толькі...

— Ужо? Так хутка?

— Так.

І ён пайшоў. Проста пайшоў. Так нічога і не сказаўшы, і не пакінуўшы, акрамя восеньскага букета, болей нічога.

А на раніцу — калі Ганка прачнулася — на стале ў яе пакоі стаяў такі ж прыгожы, такі ж вільготны букет. Толькі кожная кветка ў ім была — жоўтага-жоўтага колеру. Ад ранейшае фарбавае разнастайнасці не засталося і следу.

А што засталося? Толькі лёгкія згадкі пра шурпатыя дотыкі юначых рук, а магчыма, кляновага лісця. Толькі крыху гаркавы смак раструшчанай рабінавай гронкі на падаконні. Толькі ледзь чутны шэпт развітання ў маўклівую, ціхую восень.

Ваш Дзядзечка Сід
22 верасня 2008 г., Кобрын

Музыка з кайфам

Бела-чорны блюз

Беласток — горад блюза! Арганізатары „Года блюза" ў Беластоку стараюцца, каб сапраўды так было. З аднаго боку ёсць і традыцыі, якія даюць шанс на гэта, з другога — горад стараецца мець больш твараў: шанты, шматкультурнасць, мода. Вялікая канкурэнцыя, але блюз не паддаецца, таму 3 кастрычніка адкрываецца тут „Алея блюза". Мае яна выгляд клавіятуры фартэпіяна і напэўна больш прыемна будзе ёю шпацыраваць чым раней. Але гэта добрая нагода спытаць у вас, ці ведаеце нешта пра беларускі блюз. Напэўна не мае ён такіх багатых традыцый як польскі ці нават заходнееўрапейскі, але жыве прынамсі ў двух беларускіх музычных асяродках.

Музыкі вельмі часта не любяць, калі ўпісваць іх у адны і тыя ж рамкі, калі зараз так шмат жанраў і магчымасцей. Адзін з вядомых беларускіх блюзменаў распавядае нават пра яго супольнасць з хард-н-хэві ці нават з панкам! Юры Несцярэнка, як відаць, „музыка рэнесансу", а калі не па сваёй творчасці, то напэўна таму, што пра музыку ведае шмат: штодзень працуе на „Нашым радыё" ды вядзе гітарную студыю. Цэлае жыццё працаваў ён у сферы культуры і папулярызаваў перш за ўсё блюз і яго віды. Сам з'яўляецца лідарам двух гуртоў: „White Night Blues" і „NESTARY band". Першы гурт моцна асацыюецца з месцам Бялынічы, адкуль сам Несцярэнка. Белы колер мае тут значэнне, бо „White Night Blues" выконвае „белы блюз", а і назва мясцовасці і легенды з ёю звязаныя, таксама з „белым" маюць шмат супольнага. Затое „NESTARY band" перш за ўсё вядомы як беларускамоўны гурт, што паказвае на прывязанасць да сваёй культуры: прыгожай і багатай.

Юры Несцярэнка ў асноўным працуе на Магілёўшчыне, а ў цэнтры, у Мінску, інтэнсіўна працуе Андрэй Плясанаў. Аказваецца, беларускія музыкі не толькі актыўныя ў музыцы, але часта займаюцца і іншымі відамі мастацтва. Нядаўна свету адкрыліся графікі Ігара Варашкевіча з гурту „Крама", больш-менш у тым самым часе ў Мінску можна было глядзець фатаграфіі Андрэя Плясанава, які грае блюз у гурце „P.L.A.N.".

Як бачыце, хаця блюзменаў у Беларусі няшмат, то яны самі стараюцца напоўніць сваю музычную прастору дасканала. Пакуль што гэта ім удаецца. Хаця ў Польшчы багацей блюзу, то сярод беларускіх, падляшскіх музыкаў іх днём з агнём не знойдзеш. Цікава, а тут жа горад блюза...

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 40

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 36:

Век, сок, порт, душа, фон, дачушка, мара, такс, ваяк, калека, лёс. Варшава, код, мяса, цудак, шар, не, пачатак, рэшта, кант, факс, конь, лес.

Узнагароды, кніжку-маляванку „Прыгоды Какоса Маракоса" Сержа Мінскевіча, выйгралі **Агнешка Панасюк з Гайнаўкі і Малгажата Калінаўская з Беластока.** Віншуем!



Патомны лесавод пушчы

Тэкст і фота Таісы СКУРАТАВАЙ

Ён ахоўваў сосны, пасаджаныя дзедам і прадзедам. Цяпер яго дзеці зберагаюць пушчу для будучых нашчадкаў.

У дзяржаўным архіве Расійскай Федэрацыі захоўваецца запіска кіраўніка дзяржаўнай маёмасцю Гродзенскай губерні на імя гродзенскага губернатара, пазначаная датай 12 студзеня 1872 года. У ёй царскі чыноўнік паведамляе аб праведзеным зімовым уліку зуброў у Белавежскай пушчы і наяўнасці 429 старых і 31 маладога зуброў. Аховай зуброў займаўся прадзед героя сённяшняга нарыса.

Роўна праз сто гадоў у студзені 1972 года газета „Правда" на прыкладзе Нікарскага лясніцтва расказала аб тым, як у Белавежскай пушчы клапоцяцца пра ахову зуброў. Суровая зіма — гэта заўсёды выпрабаванне для жыхароў лесу, аднак клопат чалавека пра дзікіх жывёл дапамагае ім не толькі выжыць, але і даць паўнацэннае патомства.

Героем свайго артыкула маскоўскі журналіст самай галоўнай газеты СССР невыпадкова выбраў лясніча Яўгена Уладзіміравіча Лукшу, праўнука царскага лесніка. Малады кіраўнік так арганізаваў работу зімовых сталовых і догляд жывёлы, што моцныя маразы і вялікі снег не сталі перашкодай для іх. На тым даўнім здымку Яўген Лукша зняты з гадавалым сынам на руках. Тады ён толькі марыў, каб яго першынец пайшоў бацькоўскай дарогай. Так і сказаў аб гэтым карэспандэнту.

Прайшло без малага 40 гадоў. Сёння яго старэйшы сын Уладзімір Яўгенавіч Лукша працуе лясніччым суседняга Ясеньскага лясніцтва і, як бацька, захоплены пушчай. Лесніком Нікарскага лясніцтва працуе яго малодшы сын Аляксандр. Дачка Таццяна выбрала гарадское жыццё, але часта наведваецца з Брэста да бацькі. Падрастаюць у дзеда 5 унукаў-леснічкоў і адна ўнучка-гаспадынька.

Пра дзяцей, унукаў, пра жыццёбыццё няспешна гаворым, седзячы ў садзе на лавачцы, з заслужаным лесаводам Рэспублікі Беларусь Яўгенам Уладзіміравічам Лукшам. Патомным лесаводам. Спяшацца на працу не трэба. Ён даўно на заслужаным адпачынку. Чатыры дзесяткі лепшых гадоў аддадзены пушчы. Цяпер можна спакойна займацца гаспадаркай, разам з любімым сабакам Бімам хадзіць у лес за грыбамі, ягадамі, збіраць лекавыя травы, каля ста найменняў якіх ён лёгка называе па-латыні. Пытаюся, ці не цягне „ваўка" у лес? Здзіўляецца:

— Я і так жыву ў лесе, толькі выйдзі за веснічкі — наўкола дрымучая пушча, — паказвае ён у бок суцэльнай сцяны ельніку. — І нарадзіўся я ў глушы, у вёсачцы Язвін. Дом стаяў на беразе ракі Нарвы, у самым цэнтры пушчы. Далей размяшчаліся вёсачкі Баркі, Яловікі, Пескі... Іх цяпер не засталося на карце, — зазначае мой субяседнік. — Адны толькі дзікія грушы нагадваюць аб пасяленнях стогадовай даўнасці.

Куды ж падзеліся жывыя астраўкі сярод зялёнага мора лесу?

— Цар адсяліў гэтыя вёскі, — расказвае Яўген Уладзіміравіч. — На выгодных для сялян умовах людзей перасялілі бліжэй Свіслачы, на больш урадлівыя глебы.

— А што, браканьернічалі пушчанцы? — задаю я правакацыйнае пытанне.

— Магчыма, і гэта мела месца, але, думаю, цару не патрэбны былі вёскі ў глыбіні пушчы і вырубы лесу пад сялянскія надзелы. Да таго ж зямля там была небагатая, пясчаная, а слабыя ўраджаі, у дадатак, вытоптваліся звярынай. Вось і зняліся са сваіх месцаў сяляне без вялікага шкадавання.

Яўген Уладзіміравіч успамінае, што на месцы былых вёсак яго дзед Сямён да рэвалюцыі садзіў сасну.

— Дзед тады лесніком служыў у пушчы, — працягвае апавядаць лесавод. — А праз 80 год мне, яго праўнуку, давялося праводзіць санітарную чыстку гэтых лясных насаджэнняў. Такі вымахаў лес за два пакаленні, што проста любата!

Родную вёску Язвін з шасці дамоў і другія вёскі, што засталіся ў пушчы, спалілі немцы ў Вялікую Айчынную вайну, насельніцтва вывезлі на Беласточчыну. Ён памятае, як акупанты прыйшлі ў іх вёску. Запомніў, што стаяла летняя спякота. Вяскоўцы баяліся фашыстаў, плакала маці, калі сям'ю грузілі на падводы, а на падворках заставаліся куры, гусі, каровы, у полі даспявала збажына. З сабой загадана было ўзяць толькі хлеб і адзенне.

Пасяліліся каля Гайнаўкі ў спагадлівага селяніна Івана Вялічкі. Добра было б, марыць Лукша, сустрэць каго-небудзь з гэтай сям'і. Хадзілі ў поле, касілі, жалі жыта, аралі коньмі. А калі набліжаўся фронт, хаваліся ў балотах. Выразна чуваць была кананада.

У 1945 годзе бацька і яшчэ трое сяльчан вярнуліся на папялішчы і сталі адбудоўвацца. Вёска Язвін на тры сядзібы не мела ні крамы, ні электрычнасці. Дзяцінства Яўгену Лукшы запомнілася тым, што бегаў за 150 метраў на раку купацца, а ў суседнюю Рудню — з пацанамі ганяць мяч. Астатні час дапамагаў бацьку на гаспадарцы. У Рудні закончыў 4 класы, год самастойна займаўся, а потым здаваў экстэрнам экзамены па ўсіх прадметах. У Дабравольскую школу ездзіў 10 км на веласіпедзе. Па дарозе не раз сустракаліся звяры, не баяўся, прывык. І, мабыць, яны да яго таксама. Рана навучыўся страляць з ружжа, араць плугам, касіць касой. Як падрос, стаў працаваць лесніком Язвінскага лясніцтва. Потым у 1961 годзе яго, стараннага і адданага лесу маладога работніка, перавялі памочнікам лясніччага, а ў хуткім часе назначылі лясніччым. Ажаніўся з настаўніцай. Пражылі з жонкай многа гадоў у поўнай згодзе і ўзаемаразуменні. Пасля смерці жонкі так і застаўся Яўген Уладзіміравіч на кардоне, адзін у сваім доме. Праўда, дзеці і ўнукі часта наведваюць, не даюць сумаваць.

На тэрыторыі Нікарскага лясніцтва знаходзіцца вядомая рэзідэнцыя Віскулі. Таму да работы гэтай гаспадаркі заўсёды прад'яўляліся высокія патрабаванні. Даводзілася, як кажуць, лясніччаму трымаць вуха востра. Няўбраны своечасова буралом ці павалены сухастой мог абярнуцца нават звальненнем. А адказнасць за арганізацыю паляванняў высокапастаўленых асоб ускладвалася асабіста на лясніччага.

— Тады часта Машэраў і Кісялёў прыляталі ў Віскулі, а з імі — кіраўнікі замежных сацыялістычных дзяржаў, — расказвае аб больш блізкім перыядзе яго жыцця Я. У. Лукша.

— Першыя сакратары кампартый Чэхаславакіі, Польшчы, ГДР, Кубы, крамлёўскія правадыры прыязджалі сюды папаляваць і адпачыць. Рауль Кастра браў з сабою на паляванне жонку. А міністр унутраных спраў Шчолакаў з парога заяўляў, што прыбыў у Белавежскую пушчу адпачываць, а службовыя справы будзе рашаць у Маскве. Гэта, каб яго не турбавалі просьбамі. Часта Аляксандр Аксёнаў наведваўся сюды, таксама з жонкай. За добра наладжанае паляванне лясніччаму іншы раз перападалі невялікія падарункі. Так, пасол Германіі падарыў Яўгену Уладзіміравічу бінокль, а высокапастаўлены чыноўнік — імянны паляўнічы нож фірмы „Мессер".

— Правілы палявання захоўваліся гасцямі вельмі строга, — расказвае Яўген Уладзіміравіч. — Было перанасычэнне пушчы дзікай жывёлай і ў рамках рэгулявання іх колькасці дазваляўся селекцыйны адстрэл. З трафеяў паляўнічыя забіралі рогі аленяў і клыкі дзікоў. Іх узважвалі і грошы ўносіліся ў касу.

Пытаюся, ці не кліча зараз паляўнічы інстынкт да ружжа?

— Не, цяпер аддаю перавагу толькі грыбному паляванню і то рэдка, — зазначае лесавод.

— У канцы жніўня — на пачатку верасня выходжу ў пушчу паслухаць, як равуць алені-самцы, выклікаючы адзін аднаго на паядынак. А што тычыцца таго ці страляў я звярыну, то скажу, што ў бытнасць лясніччым сам адстрэліў 22 ваўкі. Ёсць думка, што іх не трэба забіваць, бо гэта санітары лесу. Але калі гэтых „санітараў" разводзіцца столькі, што наступае пагроза іншай жывёле, тут ужо прыходзіцца ўмешвацца чалавеку.

Яўген Уладзіміравіч расказвае, як у 1970-я гады за зімовы перыяд адстрэльвалі да пяцідзесяці шэрых драпежнікаў, а зарэзаных ваўкамі аленяў не змяншалася.

— Неяк егеры паведамілі аб з'яўленні ў першым квартале двух асабліва нахабных драпежнікаў, — успамінае Я. У. Лукша. — Праходзім адзін, другі, трэці кварталы — усюды бачым іх сляды — загрызеных цялят, а разбойнікаў няма. І толькі ў суседнім лясніцтве на іх наткнуўся мужык, што нарыхтоўваў дровы. Ваўкі побач сядзелі. Хітрыя гэта звяры і бязлітасныя. Калі іх не забіваць, то яны многа жывёлы знішчаць, нават будучы сытымі. Паляўнічы інстынкт.

— Яўген Уладзіміравіч, — задаю субяседніку набалелае пытанне, — а нашэсце на пушчу караеда — гэта для яе новая з'ява?

— Не, успышкі караедных ачагоў узнікалі і раней. Калі елка здаровая, моцная, яна раны залівае смалой. Сам часта назіраў гэта. Але пасля меліярацыі, калі вада зышла нават з майго глыбокага калодзежа, елка пачала слабнуць. Караед не замарудзіў скарыстацца такой сітуацыяй. З небяспечнымі шкоднікамі і раней змагаліся тымі ж метадамі: выкладвалі лоўчыя дрэвы, а калі караед іх засяляў, хутка ўбіралі. Для моцна населеных шкоднікам елак існуе адзін метад: спілоўванне хворых дрэў і аператыўная вывазка іх з лесу. Так было і пры цары, і пры Польшчы, і пры савецкай уладзе. Іншага метаду вучоныя не прыдумалі.

А што думае старэйшы лесавод Белавежскай пушчы наконт стварэння ў пушчы добрых дарог, развіцця турыстычнай дзейнасці?

— У тым, каб пушча захавалася, зацікаўлены ўсе, — сказаў Яўген Уладзіміравіч. — І лес будзе жыць. Проста, пушча стала больш адкрытай для турыстаў, чым, скажам, у маю бытнасць. Яе прыгажосцю можа палюбавацца кожны пры ўмове захавання правілаў паводзін у запаведным лесе. Вельмі добра, што будуюцца цудоўныя дарогі, узнаўляюцца лясныя вёсачкі. Няўжо мой дзед мог калісьці марыць пра такі клопат аб людзях на лясных кардонах? А тое, што ўдалося спыніць нашэсце караеда, гэта перш за ўсё заслуга цяперашняга дырэктара, чалавека валявога і рашучага. Добра, што на месцы вырубак правялі пасадкі і агарадзілі саджанцы ад звярыны. Лес хутка падымецца. І праз два пакаленні тут будуць стаяць дрэвы-веліканы. І ўжо маім прапраўнукам давядзецца цераз сто гадоў даглядаць лес, пасаджаны сёння сынамі.

ТУТ НАРАДЖАЎСЯ БЕЛАВЕЖСКІ ТУРЫЗМ

Пётр БАЙКО

Кожны турыст, які накіроўваецца праз белавежскі Палацавы парк у музей ці Нацыянальны парк, абавязкова зверне ўвагу на будынак з нетыповай і цікавай архітэктурай. Стаіць ён воддаль палацавай брамы, трохі на паўночны захад ад яе. Муравана-драўляны, слупавай канструкцыі з запаўненнямі. Двухпавярховы з паддашкам і двухпавярховым сярэднім выступам. Будынак быў збудаваны на плане крыжа. Даўжэйшыя крылы маюць па 28 метраў кожнае, заходняе — 18 м, а ўсходняе — 4 метры. Гэта былая стайня, якую пазней перарабілі на дом для экскурсій. Будынак уваходзіць у састаў аб'ектаў, якія спадарожнічаюць палацаваму ансамблю, збудаванаму напрыканцы XIX стагоддзя. Ваяводскі захавальнік помнікаў старадаўнасці 18 снежня 1985 года ўпісаў яго ў рэестр помнікаў старадаўнасці пад нумарам 603.

Былая царская стайня ў Белавежы на паштоўцы з 1960-х гадоў. Від ад паўднёвага захаду

Стайня магла памясціць 40 коней, якіх прывозілі ў Белавежу спецыяльным цягнікам, неўзадоўга да прыезду на паляванне цара з сям'ёй і гасцямі або вялікіх рускіх князёў. Корм для коней (сена, авёс) перахоўваўся на паддашку. У заходнім крыле змяшчаўся экіпаж. У будынку знаходзілася таксама некалькі пакояў для абслугі. Спыняўся тут і царскі кур'ер — рослы, моцны мужчына, якім захапляліся мясцовыя паненкі. У 1914 годзе ў стайню падвялі ваду.

У міжваенны перыяд, па ініцыятыве кіраўніка Нацыянальнага парку Яна Ежы Карпінскага, будынак быў прыстасаваны для патрэб турысцкай базы. Здалі яе ў карыстанне ў 1931 годзе. Турбаза мела ўсялякія выгады: водаправод, цэнтральнае ацяпленне, электрычнае асвятленне. Аднаразова, у трох залах, магло памясціцца каля 100 чалавек. Ложкі былі спружынныя, з матрацамі і пасцеллю. Турбаза падлягала мясцовай Дырэкцыі дзяржаўных лясоў і дзейнічала ўвесь год.

У верасні 1939 года ў паўднёвай частцы турбазы размясцілася перавязачная зала, якая падлягала ваеннаму шпіталю № 502, што дзейнічаў у Белавежы са жніўня таго ж года. Адной з медыцынскіх сясцёр працавала тут Зося Карпінская — дачка кіраўніка Нацыянальнага парку (зараз праф. Софія Пакацкая; жыве ў Познані).

Падчас акупацыі ў будынку турбазы немцы трымалі каля 100 рускіх ваеннапалонных. Вальдэмар Манкевіч у кніжцы „Zbrodnie hitlerowskie w Białowieży" (Белавежа — Беласток 1981) падае, што акупанты выкарыстоўвалі іх да працы ў малачарні.

Пасля II сусветнай вайны, у маі 1946 года, Дырэкцыя дзяржаўных лясоў у Беластоку сарганізавала Асяродак абучэння лясных рабочых у Белавежы, перайменаваны потым на Дзяржаўны лясны асяродак абучэння. Асяродак першапачаткова быў размешчаны ў будынку былой стайні, а потым пераведзены ў будынак даваеннай бурсы ў Дырэкцыйным парку. Арганізаваў ён кароткатэрміновыя курсы для лясных рабочых і гаёвых, а таксама 2- і 4-месячныя курсы для падляснічых. Асяродкам да канца верасня 1948 года кіраваў Рышард Жыўна.

У 1957 годзе Польскае турыстычна-краязнаўчае таварыства (ПТКТ) узяло будынак у арэнду ад Белавежскага нацыянальнага парку і прызначыла яго на турбазу. Гэтую ролю будынак выконваў паўвека. Некалькі разоў змяняліся назвы аб'екта; пачаткова была гэта Турбаза ПТКТ (Schronisko PTTK), потым Турысцкі дом ПТКТ, Экскурсійны дом ПТКТ, а на канец — Дом турыста ПТКТ. У паўночным крыле будынка да пачатку васьмідзесятых гадоў змяшчаліся таксама кватэры працаўнікоў Нацыянальнага парку.

Перад прывядзеннем турбазы ў рух быў выкананы рамонт аб'екта. Пачатак функцыянавання быў даволі цяжкі па прычыне недастатковага аснашчэння. „Gazeta Białostocka" ад 7 ліпеня 1958 года падняла трывогу: „Турбаза ў Белавежы ў гэтым сезоне выкарыстоўваецца толькі часткова па прычыне кепска аснашчаных летніх пакояў, у якіх турысты спяць на дошках. У той жа турбазе на першым паверсе турысцкія пакоі ўладжаны вельмі прыгожа. Тады чаму і на гары нельга расставіць ложкаў? Турбазай тады магло б пакарыстацца аднаразова 150 турыстаў. Для аснашчэння летніх пакояў патрэбны 200 тысяч злотых".

Стандарт турбазы не павысіўся і ў шасцідзесятыя гады. Галоўнай перашкодай быў недахоп фінансаў.

Мацей Вяжынскі, журналіст часопіса „Kultura", наракаў на яго старонках (4 верасня 1966 г.), што ў ложках дзіравыя сеткі, пазатыканыя старымі пледамі. А саму турбазу ахарактарызаваў менавіта гэтак: „Даўняя стайня мае (...) па адным санітарным памяшканні для жанчын і мужчын. Кожнае з гэтых памяшканняў мае характар купальна-асенізацыйнага камбіната. Гэта прасторныя залы, у якіх уздоўж адной сцяны змешчаны каюты з унітазамі, на другой жа вісяць пісуары, а ўздоўж трэцяй цягнецца карыта для мыцця. Падлога выкладзеная драўлянымі кратамі, на якіх лёгка можна зламаць нагу".

Нягледзячы на капітальны рамонт у 1969-1970 гадах, нараканні на стандарт гасцініцы працягваліся далей. Міхал Боўтрык, які гасцяваў у ёй пад канец 1979 года, так напісаў у часопісе „Literatura" (3 студзеня 1980 г.): „Гасцініца ПТКТ. Пакой № 3. Мёртвы сезон. Месцаў затым хапае. У пакоі чатыры тапчаны. „Мой" скрыпіць неміласэрна. Шафа: без вешалкі. Стол, чатыры крэслы, кош для смецця. Нічога больш. Аднак вобраз гэты няпоўны. Тут сустрэнем і тое, чаго няма ў спіску аснашчэння пакоя. Клапы. Атакуюць заўзята ўсю ноч. Яны прагаладалыя — гэта ж мёртвы сезон".

Не найвышэйшы стандарт гасцініцы кампенсавалі аднак жа адносна нізкія цэны і цудоўнае атачэнне. У сямідзесятых гадах Экскурсійны дом падлягаў Комплексу турысцкіх аб'ектаў у Тыкоціне, раней Праўленню аддзела ПТКТ у Беластоку.

Стандарт гасцініцы выразна павысіўся толькі пасля рамонту ў палове васьмідзесятых гадоў. Далі ёй II катэгорыю. Пакоі аднамесныя мелі ўмывальнікі, 2-, 3- і 4-месныя — поўныя санітарныя вузлы. Апрача таго былі ўладжаны апартамент, клуб з камінкам і тэлевізійная зала. У адміністрацыі прадаваліся паштоўкі і дробныя сувеніры, дзейнічаў таксама інфармацыйны пункт, які ў конкурсах заваёўваў нават адзнакі.

20 кастрычніка 1987 года ў адной зале адкрыўся бар-бістра другой катэгорыі на 40 чалавек, які арандаваў Ірыней Бахэнка.

Варта падкрэсліць, што з гэтым будынкам звязаны не толькі пачаткі турыстычнай дзейнасці ПТКТ на тэрыторыі Белавежы, але таксама пачаткі белавежскага турыстычнага экскурсаводства. Гэта ніхто іншы як першы кіраўнік турбазы Лявон Казлоўскі ўжо восенню 1957 года ад імя ПТКТ сарганізаваў першае абучэнне кандыдатаў у экскурсаводы. 26 красавіка 1959 года ўзнік Гурток экскурсаводаў ПТКТ, які налічваў 27 чалавек. Праўленне гуртка састаўлялі 3 асобы: Ян Валкавыцкі (старшыня), Аляксандра Ляпрус (сакратар) і Казімеж Пянткоўскі (скарбнік). Урачысты, першы сход гуртка адбыўся, вядома, у турбазе. У ёй таксама, у сакавіку 1969 года, Гурток экскурсаводаў атрымаў памяшканне і карыстаўся ім аж да лістапада 1970 года, калі супольна з арганізаванай у тым самым часе экскурсаводскай бібліятэкай перайшоў у палацавую браму.

У лістападзе 1976 года ў будынку размясціўся новаствораны ў Белавежы Аддзел ПТКТ, які выдзеліўся з Аддзела ПТКТ у Гайнаўцы і ў маі 1987 года прысвоіў сябе імя Яна Ежы Карпінскага.

Арганізацыя цэлага руху наведвальнікаў на гэтай тэрыторыі таксама спалучаецца з турбазай ПТКТ. У 1958 годзе Праўленне аддзела ПТКТ у Беластоку стварыла ў Белавежы Асяродак турыстычнага руху, якога прыстанішчам стаў будынак былой стайні. Асяродак гэты пазней змяніў назву на Бюро абслугоўвання турыстычнага руху, затым на Бюро турыстычнага абслугоўвання. Бюро ў турбазе змяшчалася да 1979 года. Кіраўнік турбазы пачаткова па сумяшчальніцтве выконваў абавязкі кіраўніка Асяродка турыстычнага руху, што бадай некарысна адбівалася на экскурсаводскім абслугоўванні турыстаў. Функцыі гэтыя ў 1963 годзе былі раздзелены, што выдатна палепшыла абслугоўванне гасцей турбазы і наведвальнікаў.

Белавежскае ПТКТ прымала ўдзел у арганізаванні мясцовых і агульнапольскіх рэйдаў, таксама турысцкіх злётаў, розных мерапрыемстваў з кругу кваліфікаванага турызму, лагераў Маладзёжнай школы прыродазнаўчага турызму, арганізавала турысцкія гурткі і клубы пры белавежскіх установах, а таксама ў вясковым асяроддзі, апрача таго курсы для кандыдатаў у экскурсаводы. ПТКТ у 1972 годзе адчыніла пры Экскурсійным доме пункт пракату веласіпедаў для турыстаў і адпачываючых. Яно таксама пачало арганізаваць катанні на фурманках, потым на брычках. Напрыканцы сямідзесятых гадоў дэманстраваліся прыродазнаўчыя фільмы ў кінатэатры „Зубр". Па ініцыятыве і пры непасрэдным удзеле белавежскага ПТКТ узнікла шмат шляхоў па Белавежскай пушчы.

У 1973 годзе ў белавежскім Экскурсійным доме ПТКТ урачыста адзначалася 100-годдзе польскага турызму.

Бюро абслугоўвання турыстычнага руху ПТКТ, у сувязі з рамонтам займанага ім будынка, вымушана было пакінуць яго ў 1980 годзе. Змяшчалася яно ў прыватных будынках па вул. Вольгі Габец, 3 і Трапінка, 2 (будынак гэты зараз не існуе, ён згарэў), а таксама ў кіёску з сувенірамі непадалёку стаянкі аўтамашын. З пачаткам лістапада 1982 года бюро знайшло пастаяннае месца ў адрамантаваным і мадэрнізаваным аб'екце, займаным да гэтай пары сям'ёй чыгуначніка Чарнуліча, па вул. Каляёвай, 17 (пры ўездзе на аўтастаянку).

Будынак былой царскай стайні за свой час рамантаваўся некалькі разоў. Апошні генеральны рамонт адбыўся ў 1979-1986 гадах; працы пачаткова праводзіліся (ад ліпеня 1979 г.) у адным з крылаў будынка, затым — ад снежня 1980 г. — у цэлым аб'екце. Аб'ект афіцыйна здадзены быў у карыстанне 1 верасня 1986 года. Рамонт выканала Рамонтна-будаўнічае прадпрыемства з Ольштына, а інвестарам было Акруговае аб'яднанне турыстычнай гаспадаркі таксама з Ольштына. Кошт рамонту зачыніўся сумай каля 70 мільёнаў злотых. Першымі гасцямі гасцініцы пасля рамонту былі ўдзельнікі міжнароднага мастацкага пленэру, якім вельмі спадабаўся яе клімат.

Уладжанне ў будынку вялікай залы з камінкам дазволіла праводзіць розныя нарады, канферэнцыі і сустрэчы. Традыцыйна ўжо зала выкарыстоўваецца для экскурсаводскіх курсаў і абучэнняў. Тут таксама ладзяцца навагоднія балі і вяселлі.

У шасцідзесятых гадах турбаза магла прыняць і пераначаваць аднаразова 180 турыстаў. Перад генеральным рамонтам у васьмідзесятых гадах у гасцініцы было 130 пастаянных начлежных месц, пасля рамонту асталося іх толькі 60.

У 1963 годзе праз турбазу прамільгнула 13 100 турыстаў. У 1988 годзе гасцініца дала начлег 5100 гасцям. На пачатку бягучага стагоддзя начлегамі карысталася штогод каля 4000 чалавек з краю і з-за мяжы.

Кіраўнікамі турысцкага дома былі: Лявон Казлоўскі (у 1960-х г.), Чэслаў Акола-Кулак (пачатак 1970-х г.), Уладыслаў Ляпрус (1974-1980), Альжбета Дацкевіч (ад верасня 1986 г.), Галена Семянюк (ад красавіка 1988 г.). У апошні перыяд Дом турыста падлягаў непасрэдна Праўленню аддзела ПТКТ у Белавежы.

Дом турыста ПТКТ у Белавежы закончыў сваю дзейнасць з канцом кастрычніка 2007 года і адгэтуль пустуе. Прыгожа запісаў ён старонкі гісторыі белавежскага турызму.

На Пружанскім малочным камбінаце

Віктар БУРА

На чэрвеньскім Беларуска-Польскім гаспадарчым форуме ў Гайнаўцы я пазнаёміўся з Аляксандрам Іванавічам Юркевічам з Пружан. Да нашай размовы далучылася старшыня Гайнаўскага малочнага кааператыва Вера Паўлючук. У выніку мы дамовіліся, што спадар Юркевіч пасадзейнічае наладжанню кантактаў з Пружанскім малочным камбінатам. Неўзабаве на адрас кіраўніцтва Гайнаўскага малочнага кааператыва прыйшло запрашэнне на імя яго старшыні Веры Паўлючук, яе намесніка Мікалая Зданука і ніжэйпадпісанага наведаць 28-29 жніўня малочны камбінат у Пружанах. Неадкладна афармілі мы ўсе дакументы і без клопатаў перасякалі мяжу на пагнарпераходзе ў Белавежы.

На беларускай зямлі прывіталі нас пружанскія сябры, у тым ліку і сам дырэктар камбіната Уладзімір Мікалаевіч Мікітыч. На працягу двух дзён пазнаёміліся мы з гісторыяй і сённяшнім днём малочнага камбіната.

Пачаткі камбіната сягаюць Раймаслапрама, які ўзнік у Пружанах у верасні 1939 года. Пасля вызвалення гэтая арганізацыя пастаўляла масла перш за ўсё на патрэбы арміі. У 1951 г. Раймаслапрам быў скасаваны, а малочны завод стаў самастойнай адзінкай. Выпускаў ён масла, сыры, казеін і марожанае. У 1954-1955 гг. быў узведзены новы будынак завода. З цягам часу абсталяванне мянялася на больш сучаснае. У 1996 г. завод пераўтварыўся ў акцыянернае таварыства „Пружанскі масласырзавод", а ў 1998 г. — у адрытае акцыянернае таварыства „Пружанскі малочны камбінат".

Цяпер асноўным відам дзейнасці камбіната з'яўляецца перапрацоўка малака і малочнай сыроваткі ды вытворчасць малочных прадуктаў. З невялікага завода, які перапрацоўваў да 2 тысяч тон малака ў год, пасля сёлетняй рэканструкцыі цэхаў камбінат стане прадпрыемствам здольным перапрацоўваць да 100 тысяч тон малочнай сыравіны ў год. На камбінаце працуе 420 чалавек. Сыравінную базу складаюць 20 гаспадарак Пружанскага раёна. З мэтай павышэння якасці малака спецыялісты камбіната дапамагаюць калгасам халадзільным абсталяваннем і кансультацыямі.

Пружанскі малочны камбінат у 2006 г. быў прызнаны лепшым экспарцёрам у рэспубліцы. Камбінат ужо 40 гадоў высылае сваю прадукцыю асноўнаму і адзінаму замежнаму партнёру ў Расійскай Федэрацыі. Экспарт сыру (4561,8 т) і масла (693,1 т) у 2007 г. амаль у 9 разоў перавысіў экспарт 2002 года.

ААТ „Пружанскі малочны камбінат" — уладальнік сертыфікатаў адпаведнасці СТБ ІСО (2005, 2007), лаўрэат, між іншым, конкурсаў „Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь" (2003), „Густ" (2006), дыпламант міжнародных выставак харчовых тавараў „Продэкспо" (2004-2007). Сёлета на міжнародным саміце ў Маскве камбінату быў прысвоены знак „Лідара нацыянальнай эканомікі 2008 года".

— Бясспрэчна, перамога нашага камбіната гэта вынік стараннай працы ўсяго калектыву прадпрыемства і яна нам вельмі дарагая, — сказаў дырэктар Уладзімір Мікітыч.

Апрача камбіната пабачылі мы ферму малочных кароў. Ферма гаспадарыць на 4000 гектарах і трымае 2900 штук рагатай жывёлы, у тым ліку 900 кароў. Уся ферма механізаваная і камп'ютарызаваная. Ва ўсім Пружанскім раёне такіх ферм трыццаць.

Пасля вяртання ў Гайнаўку доўга мы ўспаміналі пабачанае і сардэчнасць з боку нашых пружанскіх сяброў. А Гайнаўскі малочны кааператыў паслаў ужо запрашэнне кіраўніцтву ААТ „Пружанскі малочны камбінат" наведаць Гайнаўку. Чакаем гасцей, будзем ім вельмі рады!

Нягледзячы на адносную колькасную беднасць беларускамоўнага інтэрнэта, час ад часу там адбываюцца падзеі, якія не могуць не ўразіць. Зразумела, гэта звязана са з'яўленнем сайта, які прыцягвае ўвагу карыстальнікаў не толькі адно фактам свайго нараджэння, але і зместам, які дае падставы сцвярджаць — як і Байнэт, так і ўласна беларуская культура маюць пакуль трывалыя пазіцыі нават у сённяшні глабалізаваны час. Прыйсці да такой высновы прымушае сайт „Творы", што месціцца па адрасе http://www.tvory.byhost.org.

Сайт насамрэч незвычайны. Мала таго, што ён цалкам беларускамоўны, то яшчэ і ахоплівае цэлае сучаснае культурнае жыццё аднаго з адносна буйных беларускіх гарадоў — Баранавічаў. Стваральнікі сайта, па ўсім відаць, прыклалі нямала намаганняў, каб зрабіць гэты адзіны ў сваім родзе інтэрнэт-рэсурс, і гэта ім удалося. Каб не быць галаслоўным, раю наведаць некалькі старонак „Твораў", напрыклад, такія як „Кнігі на беларускай мове", якая з'яўляецца падрубрыкай „Беларускай літаратуры". Тут мы знойдзем як уласна гэтыя самыя кнігі ў электронным выглядзе, так і невялікія анатацыі да іх. Але гэта яшчэ не ўсё — на сайце сабрана вялікая колькасць твораў таленавітых людзей Баранавічаў, якая размешчана ў такіх рубрыках як „Выяўленчае мастацтва", „Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва", „Фотамастацтва", „Беларуская песенная творчасць" і іншых. У кожнай рубрыцы ідзе своеасаблівая прэзентацыя таго ці іншага майстра слова ці пэндзля з Баранавічаў, які займаецца сваёй улюбёнай справай. Распавесці пра кожнага ў межах артыкула немагчыма, таму настойліва раю зазірнуць на сайт, каб пазнаёміцца з людзьмі, якія робяць гонар свайму гораду.

А робяць гонар Баранавічам і юныя творцы. І такіх там нямала, хоць можа на сайце ў даны час прадстаўлены толькі некаторыя з іх. Рубрыкі „Сшытак юнага літаратара" і „Галерэя юнага мастака" даюць упэўненасць, што талент у мясцовых юнакоў — невычарпальны. Дарэчы, вельмі прыемна чытаць іх вершы, складзеныя па-беларуску, асабліва зважаючы на тое, што за цяперашнім антыбеларускамоўным часам у Баранавічах няма ніводнага беларускамоўнага класа ў школах альбо гуртка ў дзіцячых садках. Аб гэтым вельмі падрабязна распавядаецца ў рубрыцы „Праблемы беларускай культуры і мастацтва". „Дастаткова прыйсці ў навучальныя ўстановы і паслухаць, што дзеці размаўляюць па-беларуску толькі на ўроках беларускай мовы і літаратуры, калі іх выкліча настаўніца. У школах горада няма ніводнага беларускага класа, у якім усе вучэбныя прадметы вядуцца на беларускай мове. Родная мова ў гарадскіх школах нібы замежная", — з боллю ў душы пішуць стваральнікі сайта. Дарэчы, гэтую праблему яны прапануюць абмеркаваць наведвальнікам (праўда, пакуль адпаведная старонка абмеркавання застаецца пустой).

Варта адзначыць, што выйсці да рубрык сайта месцяцца не толькі з левага боку, але і зверху. Тут падаюцца „Навіны культуры", кантакты баранавіцкіх творцаў, а таксама вельмі падрабязнае апісанне сайта, які сваімі намаганнямі стварылі сябры баранавіцкага Творчага згуртавання «Святліца».

Уладзімір ЛАЦПЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

Удалая „пераправа"

Падобныя праблемы перажываюць апошнім часам беларускія баскетбольная і тэнісная мужчынскія дружыны. Абедзве падышлі да непазбежнай „пераправы", калі жыццё змушае істотна змяняць і амалоджваць склад. Працэс гэты амаль заўсёды цягнецца хваравіта і, здараецца, выцякае ў зацяжны крызіс. Тым больш прыемна, што абедзве названыя каманды, здаецца, пайшлі правільным курсам.

Пачнём з баскетбольнай зборнай. Паўгода яна была „вершнікам без галавы" — садзіцца на гарачую патэльню, ці можна сказаць таксама папялішча, доўга не адважваўся ніхто з трэнераў. Урэшце няўдзячную пасаду заняў Аляксандр Папкоў, які дагэтуль працаваў з мінскім РТІ, „Гродна-93", а таксама юніёрскімі і моладзевымі дружынамі рознага веку. У першых спарынгах беларусы саступілі грознай Літве. Затое пасля ў 10 таварыскіх і афіцыйных матчах зборная Беларусі здабыла стоадсоткавы вынік — 10 перамог (!). Падобнай серыі не было ў яе шаснаццацігадовай гісторыі. Дзеля аб'ектыўнасці варта сказаць, што сапернікі былі не экстра-класа. Але самае галоўнае, што падначаленыя Папкова выйгралі ўсе 4 матчы адборавага турніру ў сваёй групе серыі „В" — у Румыніі, Албаніі, Швейцарыі і Кіпры. Становішча пасля першага кола цяпер такое: Беларусь — 8 пунктаў, Румынія і Швейцарыя — па 6, Кіпр і Албанія — па 5. Можа і добра, што еўрапейская асацыяцыя падзяліла ўсе дружыны старога свету па дывізіёнах (хоць гэта і несправядліва, бо ў кантынентальным баскетболе няма такой розніцы паміж зборнымі, як прыкладам у хакеі, дзе падзел цалкам слушны). У зборнай Беларусі ёсць час сфармавацца і вырасці ў сапраўды канкурэнтны ў Еўропе калектыў. Зваротная дарога ў дывізіён „А" будзе няпростай, але ўдалы старт абнадзейвае. Касцяк новай дружыны гуртуецца зараз вакол лідара — Ягора Мешчаракова, дадам, што ў абноўленай дружыне не выступаў пакуль мацнейшы наш баскетбаліст Уладзімір Верамеенка. А галоўнае — Аляксандр Папкоў разлічвае не на 5-6 гульцоў, а на паўнавартасную абойму — годная лаўка рэзервістаў ці не галоўны зараз чыннік у сучасным баскетболе.

Падобным шляхам ідзе і наша тэнісная зборная. Пасля 5 запар паразаў у Кубку Дэвіса Уладзімір Ваўчкоў завяршыў свае выступы за яе, а Максім Мірны дэкларавaў удзел толькі ў парных сустрэчах. Менавіта Ваўчкоў быў прызначаны новым капітанам дружыны і яго трэнерскі дэбют выдаўся ўдалым. Зборная Беларусі завяршала бягучы сезон матчам у Мінску супраць Грузіі. Дыспазіцыя была простай — пераможца заставаўся ў 1-й групе Еўра-Афрыканскай зоны Кубка Дэвіса, саступіўшы — вылятаў у ніжэйшую 2-ю групу (на гэтым дне мы былі дзесяць год таму, а за гэты час здолелі пабываць нават у эліце). На гэты раз за Беларусь у адзіночных паядынках былі заяўлены 18-гадовы Уладзімір Ігнацік і 19-гадовы Андрэй Каратчэня, а пару склалі ветэран Мірны з 21-гадовым Сяргеем Бетавым. У першым паядынку Ігнацік упэўнена з сухім лікам разабраўся з больш старэйшым сапернікам. А ключавой стала сустрэча Каратчэні з крыху больш рэйтынгавым Іракліем Лабадзэ — пяцісетавая дуэль завяршылася вікторыяй нашага тэнісіста. Ну а ў парным спаборы, пры ліку на карысць нашых, той жа Лабадзэ адмовіўся працягваць гульню. Па ўзаемнай дамоўленасці матч працягваць не сталі і ў выніку Беларусь перамагла 3-0. Цяпер патрэбна будзе зрабіць наступны крок — у 2009 годзе ў новым розыгрышы нашы сустрэнуцца ў траўні з пераможцам пары ПАР — Македонія.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

У Гарадзіску

Расказ Яна ХІЛІМАНЮКА — жыхара Гарадзіска Нарваўскай гміны.

— Гарадзіска ляжыць недалёка шашы Гайнаўка — Беласток ля самой Лядскай пушчы. У вёсцы — 31 дом, у тым ліку 7 пустых. Жывуць тут у пераважнай большасці пенсіянеры. Пустуючыя хаты наведваюць гарадскія наследнікі іх уладальнікаў.

Моладзь пасля заканчэння школы ўцякае ў гарады, паколькі не бачыць перспектыў для далейшага жыцця. Вясковых дзяцей давозяць у школу ў Нарву. Можна сказаць, што гэта мядзвежы куток.

Аднак калі глянуць з іншага боку, тады відаць, што ўлады дапамагаюць жыхарам у розных справах. Колішні войт Ян Тапалянскі паклапаціўся, каб разам з жыхарамі пабудаваць святліцу. З гэтай мэтай куплены былі два дамы ў Скарышэве. Жыхары Гарадзіска разабралі іх і атрыманы матэрыял перавезлі конным транспартам ды паставілі святліцу. Аснашчана яна модным лавамі і сталамі, посудам і газавай плітой. У святліцы, якая можа памясціць пад 100 чалавек, праводзяцца розныя ўрачыстасці. Гміна забяспечвае святліцу апалам.

Іншы былы войт і ўраджэнец вёскі Ян Іванюк паклапаціўся пакласці асфальт на вясковай вуліцы, а цяперашні войт Якуб Садоўскі адрамантаваў дарогу з Гарадзіска да шашы Гайнаўка — Беласток.

Насельніцтва вёскі задаволенае дзеяннямі гмінных улад, а ўлады ганарацца такой актыўнай і добрасумленнай супольнасцю. Трэба адзначыць добрыя міжлюдскія адносіны ў Гарадзіску, у адрозненне ад іншых вёсак, у якіх на парадку дня зайздрасць, нянавісць і неабгрунтаваныя абвінавачванні.

Мясцовае насельніцтва ў пераважнай большасці займаецца сельскай гаспадаркай. Зямля тут гліністая, цяжкая для апрацоўкі, але дае добры ўраджай. Вёска знаходзіцца быццам на крыніцы. Увесь год у рэчцы стаіць вада, а ў кожнай студні, нават у той на ўзгорку, поўна вады. Памалу развіваецца жывёлагадоўля, а 8 сялян лічыцца добрымі земляробамі. Ян Ніканчук апрацоўвае 80 гектараў зямлі і займаецца свінаводствам. У яго два трактары маркі „Урсус" і „Зетар". Малочных кароў гадуе Уладзімір Тэслюк. Ён купіў умяшчальнік для малака, за якім на панадворак прыязджаюць машыны Гайнаўскага малочнага кааператыва.

Амаль кожны пенсіянер мае свой занятак. Чатырох займаецца пчалярствам: Аляксандр Кураш, Мікалай Тэслюк, Юрый Масайла і Ніна Мінько. Апошняя жыве пры самым лесе. Яна — энергічная і старанная жанчына, заўсёды нешта будуе або рамантуе, можна сказаць, што працуе так рупліва як пчолка. Іншыя пенсіянеры замест кароў гадуюць коз. Па адным кані трымаюць Аляксандр Кураш і Рыгор Врублеўскі.

У Гарадзіску сустракаюцца і адзінокія мужчыны. Але што ж ім рабіць, калі паненкі ўнікаюць працы на гаспадарцы, бо яна цяжкая і брудная.

Старэйшыя людзі дажываюць да сваіх апошніх дзён. Найстарэйшым мужчынам з'яўляецца Рыгор Врублеўскі (1922 года нараджэння), а найстарэйшай жанчынай — Параскева Кураш (1908 года нар.).

Можна сказаць, што ў Гарадзіску дзеецца шмат добрага і яго жыхароў можна ставіць у прыклад іншым.

Запісаў Андрэй ЯЛОЗА

Смярдзючая праблема

У пачатках XX стагоддзя ў Чаромсе пабудавалі лазню, якой чыгуначнікі карысталіся пры даўнай Польшчы і пасля вызвалення. За будынкам быў пракапаны роў, якім адводзіліся сцёкі ў напрамку кузаўскіх паш.

У рыначнай эканоміцы лазня стала непрыдатнай і дзяржаўная чыгунка прадала маёмасць прыватнай асобе. Але ад лазні засталася водаадводная канава, якая патрабуе абкошвання выемкі ў летні час, ачысткі яе ад пустазелля ды непрыдатных карчоў. Хто павінен заняцца справай: жыхары прылеглых сядзіб, гміна, а мо чыгунка, паколькі гэта яе ўласнасць? У цэнтральнай частцы, ад будынка лазні па касцёл, не бачу праблемы. Роў абчышчаны і абкошаны, нават мосцік з балюстрадамі сёлета збудавалі, каб укругавую з гміны ў дом культуры не хадзіць. Праўда, войта абвінавачваюць у незаконным правядзенні інвестыцыі, але мосцік разбіраць не стануць, бо ў сапраўднасці ён патрэбны.

На далейшым адрэзку канавы, насупраць вагоннага дэпо, напрыклад, адзін Садом і Гамора. Роў парастае карчамі ды пустазеллем і па берагі напоўнены забруджанай вадою. Летам у сонечнае надвор'е толькі смурод адсюль разносіцца. А непадалёк жывуць людзі. Па-мойму, праблемы не было б, калі б водаадводная канава была дагледжана і вада сплывала на поле за жылы квартал. А мо варта пахадайнічаць за еўрасаюзныя сродкі, каб вырашыць праблему смярдзючай водаадводнай канавы? Усё ж такі справа тычыцца аховы асяроддзя. **(ус)**

Небяспечна ў Беластоку

Яшчэ нядаўна аб Беластоку гаварылася як аб адным з беспячнейшых гарадоў у краіне. Апошнія падзеі не дазваляюць мне на такое меркаванне. Вось гэтаму доказы.

3 верасня ў пасляабедні час у жылым квартале па вуліцы Бэма невядомы аўтамабіль раз'ехаў вядучага ровар мужчыну. Ровар дашчэнту паламаны, а пацярпеўшы апынуўся на артапедычным аддзяленні паліклінікі. У яго паламаная нага. А злачынца ўцёк з месца здарэння.

Некалькі дзён пазней, 6 верасня, непадалёк вуліц Палескай і Таваровай ідучага на аўтобусны прыпынак пенсіянера напалі хуліганы і сталі патрабаваць грошай. Калі гэты пачаў бараніцца, пачалі яго біць бейсбольнымі палкамі. Старэча паспрабаваў астаткам сіл уцячы, але злыдні накінуліся на яго і далей лупцавалі. Мужчына страціў свядомасць, а злачынцы засталіся невядомымі. Пацярпеўшага угледзеў прахожы і паведаміў хуткую дапамогу, якая адвезла яго ў бальніцу. Кур'ёзам застаецца факт, што ягонай жонцы ў час пошукаў мужа каля адзінаццатай гадзіны вечара на хуткай дапамозе адказалі, што такое прозвішча (як прад'явіла жонка пацярпеўшага) для іх невядомае. Сям'я надалей шукала свайго мужа і бацьку. Калі паўторна жанчына пазваніла на нумар 999, а было гэта каля трэцяй гадзіны ночы, дыспетчар толькі тады прызналася, што было зарэгістраванае здарэнне непадалёк вуліцы Палескай, а пацярпеўшага адвезлі ў паліклініку. І што аб гэтым можна падумаць, даражэнькія? Народна мудрасць гаворыць: „У нашым палку няма ніякага толку". Святая праўда. **(ус)**

Адгаданка



Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — кітайскую прыказку.

1. сербскі горад на ўсходзе Вайводзіны = 25 _ 4 _ 1 _ 34 _ 43 _;
2. цвёрдае гаручае выкапнёвае рэчыва арганічнага паходжання = 52 _ 53 _ 45 _ 46 _ 30 _ 44 _ ;
3. злая, зневажальная насмешка або зневажальны ўчынак ці паводзіны ў адносінах да некага = 39 _ 17 _ 9 _40 _ 27 _;
4. гарадок між Лідай і Валожынам = 55 _ 49 _ 26 _;
5. марка расійскіх грузавікоў = 54 _ 28 _ 29 _ 8 _ 14 _;
6. прывід, туман, смуга = 20 _ 5 _ 18 _ 19 _ 12 _ 13 _;
7. „камп'ютарны" грызун = 15 _ 3 _ 33 _;
8. урачысты верш прысвечаны важнай падзеі або герою = 48 _ 47 _ 51 _;
9. з яе слова не выкінеш = 32 _ 31 _ 41 _ 50 _ 42 _;
10. фігура падобная на чалавека для адпуджвання птушак з палеткаў = 2 _ 16 _ 21 _ 22 _ 23 _ 24 _;
11. „сяброўка" хады = 35 _ 36 _ 38 _ 37 _;
12. драўляны хамут для валоў = 6 _ 7 _ 10 _ 11 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 35 нумара

Ход, драніца, самасуд, Быкаў, рэверс, нос, цэль, амяла, бас, люізіт, толь, Карскі, езуіт, арба, барометр, дынама, снід, салат, Комі.

Рашэнне: **Дрэва наносіць удар аўтамабілю толькі дзеля самаабароны.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лукашу Пацэвічу** і **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: I kwartał 26 zł. do 5 grudnia 2008 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego oraz oddziały „Ruch" i „Kolporter" na terenie całego kraju.
Prenumerata z wysyłką za granicę **pocztą zwykłą** wynosi: kwartalna — 131 zł.; półroczna — 224 zł.; roczna — 374 zł. **Pocztą lotniczą**: Europa — prenumerata kwartalna — 142 zł., półroczna — 243 zł., roczna — 405 zł. Ameryka Północna, Południowa, Środkowa, Afryka, Azja — prenumerata kwartalna — 160 zł., półroczna — 274 zł., roczna — 456 zł. Australia i Oceania — prenumerata kwartalna — 204 zł., półroczna — 350 zł., roczna — 583 zł.
Wpłaty do 5 dnia miesiąca poprzedzającego prenumeratę przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A. IV O/ Warszawa,
Nr 68 1240 1053 1111 0000 0443 0494.
Prenumeratę można zamówić w redakcji. Planowana ilość numerów „Niwy" w 2008 roku — 52.
Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,65 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł.
Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 320 egz.

А я люблю восень і гук гітары...

Юрка БУЙНЮК

Фота Міры ЛУКШЫ

Я вельмі люблю музыку. Пасля паэзіі гэта маё другое зацікаўленне. Вельмі шкадую, што правёўшы дзяцінства ды частку маладосці ў вёсцы, не меў я шчасця закончыць музычнай школы. Ужо змалку гуляў з сябрамі-аднавяскоўцамі ў гурт. Асабліва люблю гітару. Люблю слухаць, як хтосьці прыгожа іграе на гэтым інструменце. Гітары ёсць розныя: электрагітары, класічныя з нейлонавымі струнамі, але я асабліва люблю акустычныя гітары са сталёвымі струнамі, бо гук з такіх струн вельмі выразны. Пражываючы пяць гадоў маёй вучобы ва ўніверсітэце ў студэнцкім інтэрнаце ў Беластоку я наслухаўся, як чароўна можа гучаць акустычная гітара на калідоры інтэрната, а прытым як дружна спяваецца з сябрамі вядомыя песні. А спявалася розныя! Падабаліся беларускія, украінскія ды рускія народныя песні, вядомыя ўсіх маладым на Беласточчыне. Даспадобы мне былі песні вядомых польскіх рок гуртоў *Lady Pank, Dżem,* Kukiz і *Piersi, Perfect, Big Cyc, Oddział Zamknięty, Chłopcy z Placu Broni.* Аднак вельмі хацелася навучыцца зайграць самастойна штосьці з-за ўсходняй мяжы: беларускіх, украінскіх ці расійскіх рок-гутоў такіх як *Н.Р.М.*, *Уліс*, *B:N:*, *J-Mors* або ўкраінскіх: *Океан Эльзы*, *Друга Ріка*, *Горпына*, *Воплі Відоплясова*, *Фліт*, *Бэркут* і многа іншых. З расійскіх мне вельмі падабаецца *Любэ*. Расійскія гурты, якія мне таксама падабаліся гэта: *Ария*, *Кино*, *ДДТ*, *Чёрый кофе* а таксама мой любімы бард Булат Акуджава.

Бардаў таксама я вельмі люблю слухаць асенняю парою — восенню найлепшы настрой паслухаць штосьці ўзнёслае. Гітара — цудоўны інструмент для бяседы пры вогнішчы, яднання новапазнаных людзей. У інтэрнаце па вуліцы Кракаўскай у Беластоку, там дзе я жыў, шмат людзей умела іграць на гітарах. Седзячы ў пакоі можна было пазнаць нават па самой манеры ігры, хто на калідоры іграе. Дзяўчаты заўсёды далікатней чымсьці хлопцы ўдаралі ў струны і мне гэта запамяталася.

Цудоўна ўспамінаю час, калі на пачатку ліпеня 2003 года ў адзін сонечны аўторак з'ездзіў я са сваёй вёскі Маліннікі ў Беласток, каб купіць сваю першую гітару. Я памятаю гэтае спантаннае хваляванне, зусім смаркатую радасць і ўсмешку мілага прадаўца, які запакоўваў маю першую новенькую гітару. Помню, калі ішоў з вялікай радасцю ў гарачы сонечны дзень з гітарай на плечуку, што маю сваю гітару...

Вечарамі прыходзіў да мяне мой сусед-аднавясковец, таксама Юрка і вучыў мяне іграць на гітары. Ён старэйшы, вопытны, іграў на шмат якіх інструментах, але найбольш упадабаў сабе гітару, цудоўна на ёй іграў вядомыя народныя беларускія песні, а прытым мы абодва спявалі. Юрка так добра іграў, што па пару першых акордах я адрозніваў, якая гучыць песня. Я часта прыходзіў да яго нядзельнымі вечарамі, калі ён прыязджаў з Беластока да бацькоў.

„Ой як прыгожа спяваеце і іграеце! — услухоўвалася цётка Тоня Нічыпарук, Юркава маці, і хваліла мяне: — І ты маеш добры голас!" — „Ну што вы, тёто, я пакуль зачынаю вучыцца!" — я стараўся стрымана сябе весці перад цёткай Тоняй, якая спявала ў царкоўным хоры ў Маліннікаx і была вясковым аўтарытэтам сярод жанчын з Маліннік, а абодва яе сыны Генік і Юрка ў талентах пайшлі па ёй. Калісьці яны іграліразам па вяселлях. Адзін, найстарэйшы, Генік іграў на клавішах, малодшы Юрка — на электрагітары.

Чаму я тады купіў гітару? Трэба вярнуцца да 1997 года, калі, маючы 16 гадоў, пачаў я пісаць свае першыя песні. За год я мог сваімі песнямі запісаць цэлы сшытак. Пісаў я, вядома, па-беларуску, але не меў ніякага інструмента ды не ведаў нот, і зусім не ўмеў іграць, толькі хадзіў ды падспеўваў мелодыі. Калі трапілася цікавая мелодыя, я запісваў свой голас на магнітафоннай касетнай стужцы. За гэтыя гады назбіраліся ў шуфлядзе майго пісьмовага стала поўна сшыткаў маіх песень ды плёнак з мелодыямі да іх. Пачаў я збіраць грошы, малыя, але ўсё ж грошы, і так у 2002 годзе восенню купіў я першую гітару. Прынёс я яе ў інтэрнат з вялікай радасцю, а мой сябра Андрэй з пакоя ў інтэрнаце коса на мяне паглядзеў: „І навошта купіў? Думаеш, так проста навучыцца на ёй? Ты мусіш за настаўніка заплаціць, бо сам не навучышся". Я адказаў, што можа ён мяне навучыць, бо ён у Беларусі закончыў музычную школу. Але каб не вучыць мяне іграць на гітары, ён адмовіўся тым, што не ўмее. А я сам добра памятаў, як калісьці ў пакой прынёс ён пазычаную ад кагосьці старую гітару і іграў свае рускія хіты! Я з вялікім жалем аднёс сваю любімую шасціструнную сяброўку праз пару дзён у краму, дзе купіў і з жалем прадаў. Аддаў сваё шасціструннае сэрца, якога мне не хапала ў восеньскія вечары! Другую гітару я купіў, як ужо сказаў, у ліпені 2003 года і цэлыя калікулы я іграў на ёй, але хутчэй перашкаджаў бацькам, якія мучылі вушы ад маёй вучобы, усё ж не выгналі мяне з хаты. Вядома, купіў я яе за свае грошы.

Прыйшла восень і я выехаў на вучобу ў інтэрнат у Беласток. Хаця мае сябры намаўлялі мяне, каб узяць гітару з сабою ў Беласток, я не схацеў, бо ведаў, што многа студэнтаў хацела б пазычаць яе на вечарнкі. Ведаў таксама, што могуць па-п'янаму пашкодзіць мне гітару. А ў інтэрнаце, вядома — імпэзы, гітары і спеў. Аднак я не прызнаваўся, што вучуся іграць, бо многія лепш іграліі не хваліліся. Новы акадэмічны год і новыя студэнты, і новыя суседзі, ды якія! На нашым паверсе трапіліся адны музыканты! У адным пакоі жылі хлопцы, якія мелі свой рок-гурт, у другім — адзін клавішнік Томэк Бжазоўскі, што вучыўся іграць на гітары, таксама меў свой гурт. Так мы з Тамашом і пасябравалі. Я любіў прыходзіць да яго паслухаць, як іграе на клавішах або гітары. На клавішах іграў усё — ад польскіх да замежных стандартаў, вядомыя сусветныя стандарты як *Qeen* ці Richarda Marxa, але найлепш любіў іграць песні Севярына Краеўскага, якога творчасць вельмі паважаў. Тамаш вучыўся іграць на гітары і часта мне паказваў, а начучанне ішло яму вельмі спраўна. Мы мяняліся сваім вопытам. Мінуў год і на дажджлівых канікулах 2004 года пачаў я запісваць вае першыя песні пад гітару. Запісваў пры дапамозе мікрафона падключанага да музычнай устаноўкі, на магнітафонную касету. Да таго я купіў мікрафон, а сваю першую касету з аўтарскімі песнямі пасля канікул у кастрычніку 2004 г. даў паслухаць маім сябрам. Адным падабаліся мае песні, але многія казалі, што перада мною шмат працы. Калі купіў я свой другі новенькі камп'ютар, пачаў на спецыяльнай праграме ўводзіць з магнітафона ў камп'ютар песні запісваючы іх у музычны фармат *mp3.* Спачатку быў гэта вельмі дрэнны запіс, але калі мой сябра, які працуе на радыё, падкінуў мне прафесійную праграму, дык я пачаў гуляць з якасцю гука, папраўляючы яго да лепшага гучання. Так я назбіраў шмат песень, якія даў паслухаць майму сябру, што мае сваю студыю. Ён сказаў, што чакае мяне шмат працы, але я на добрым шляху. Сказаў мне, каб я не марнаваў таленту.

Сваё іграннe я занядбаў, бо пачаў працаваць. У той час я жыў ў горадзе, а гітара была на вёсцы, — мне яе не хапала. Заўсёды здавалася мне, што я сваё сэрца пакінуў на вёсцы. Аднак зімою 2007 г. рашыў я купіць сабе другую гітару. Сабраўся на пакупкі са сваім знаёмым са студэнцкага інтэрната, які мае сваю рок-групу ды цудоўна іграе на гітары. Пахадзілі мы па магазінах, аж урэшце выбралі цудоўную гітару маркі *Crafter.* Гэта электраакустычная гітара з мікрафонам унутры. Праз спецыяльнае гняздо можна яе падключыць пад камп'ютар і запісвацца ў добрай якасці амаль прафесійна. Якасць гуку ў ёй непараўнальна лепшая чым у старой гітары. Я жыву! Я задаволены і мне не шкада грошай, каб здзейсніць свае мары! Зараз спатыкаемся з сябрам, з якім пасля працы іграем песні і нават нам няблага атрымоўваецца!

05.10 — 11.10

(22.03. — 20.04.) Адважныя прыёмы, актыўны паспяховы высілак. У тваім жыцці наступяць вялікія змены. Калі што стане табе на дарозе, хутка з гэтым расправішся. Праз страўнік можаш залезці камусьці ў сэрца!

(21.04. — 21.05.) Да 9.10. — шмат паспяховых сітуацый, зрэалізуеш самыя смелыя планы. Усміхнецца да цябе шчасце! Асабліва прыязны свет 8 кастрычніка. З 9.10. (да 13.10.) кепскі знак для прафесійных і сямейных спраў; не ўключайся ў гэты час у прыватныя справы калег па працы.

(22.05. — 22.06.) Да 6.10. абмінеш сітуацыі небяспечныя і такія, якія могуць давесці цябе да страт. 5-9.10. ненайлепшая фінансавая кан'юнктура. Не прапускай у гэты час ніякіх дробязных дэталяў, бо яны якраз могуць быць самым важнымі. 10.10. і 11.10. можаш мець праблемы на працы і ў падарожжы.

(23.06. — 23.07.) У першыя дні будзеш задаволены, удасца табе ў інтарэсах і ва ўстановах. З 9.10. пазбягай афармлення важных фінансавых спраў. І пільнуй кашалька! На працы хтось цябе паставіць пад сцяной і будзеш мусіў выбіраць. Яшчэ раз пераканаешся, што твой партнёр — самы-самы.

(24.07. — 23.08.) Да 8.10. будзеш мець ахвоту ва ўсім ісці напрасткі. Хтось вельмі таямнічы і неардынараны кіне на цябе чар. Не злоўжывай сваёй уладай дома, асабліва над дзецьмі. Хоць будзеш спраўны ды бадзёры, не з усім справішся на час.

(24.08. — 23.09.) Нерэалістычныя і непрактычныя мары. Пазбудзешся нясмеласці, але і сціпласці. Ад 5 да 9.10. не разлічвай на нагоды і шчаслівыя выпадкі. 6-10.10. могуць паявіцца праблемы ў дробных справах, якія з часам могуць стаць сур'ёзнымі.

(24.09. — 23.10.) Да 9.10. знакаміта дасі сабе рады ў фінансах. Таксама ва ўстановах пойдзе ўсё выдатна. З 8 да 12.10. вырашыш справу, якая здаўна цябе мучыла. Дзякуючы неканвенцыянальным помыслам можаш шмат зарабіць. З 9.10. (да 13.10.) хтось схоча цябе выкарыстаць; пазбягай рандэву і складаных размоў з партнёрам.

(24.10. — 22.11.) Адвага і здольнасць перамагання ўсіх складанасцей. Дасі партнёру зразумець, што твае патрэбы — найважнейшыя. У справах кар'еры ты непераможны! Добрае здароўе (увесь месяц), але пагражаюць табе раны і ўдары.

(23.11. — 22.12.) Да 7.10. ашаламляючы поспех у супрацьлеглага полу. Справішся прыпяваючы таксама і ў фінансах. Да 8.10. цяжка будзе табе выканаць абяцанні. Не праваронь нагоду, каб пры дапамозе нейкай уплывовай асобы дасягнуць намечаную мэту. 5-09.10. можаш непатрэбна ўлезці ў разборку; не надта добры час і на экзамены.

(23.12. — 20.01.) 5-9.10. узмоцняцца рэляцыі ў тваёй пары, усё стане на вельмі стабільным грунце. Добры час на фінансавыя аперацыі. Затое з 9.10 (да 13.10.) могуць паявіцца нечаканыя матэрыяльныя клопаты; не бяры нічога ў крэдыт, не страхуйся, не разлічвай на чужыя грошы.

(21.01. — 19.02.) 8-12.10. — лёгкасць у наладжванні кантактаў. На другім поле зробіш маланкавае ўражанне. Сцеражыся фальшывых сяброў. З 10.10. могуць папсавацца стасункі ў сям'і. Не паддавайся благім звычкам!

(20.02. — 21.03.) Лёс табе спрыяе: заграй у латарэю ці на біржы. 9-13.10. могуць зашкодзіць табе нясвежыя харчы або празмернасць ежы. Лепш не дамаўляйся на рандэву з 8.10.; можаш улезці ў кантакт, які будзе табе шмат каштаваць.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960